

МУЗЫКА МОВЫ **6**

АДВАГА НЯМЕЦКАГА ПАРТЫЗАНА **12**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛІСТАПАДА 2022 г.
СЕРАДА
№ 230 (29852)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль НАСЕНЯ, член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў:**

*«Прамыя страты ад спынення паставак у Еўропу склалі каля 6 млрд долараў, але на рынках Расіі і Кітая наша краіна ўжо аднавіла $5 млрд. Ідзе сістэмная пераарыентацыя транспартных патокаў з недружалюбных краін на іншыя напрамкі. Дзякуючы гэтаму, на рынках Расіі і Кітая мы ўжо змаглі аднавіць амаль 80 працэнтаў страт. З сыходам так званых брэндавых кампаній з Расіі з'явіліся нішы для нашых вытворцаў. Мы іх можам заняць. І зараз у гэтым напрамку ідзе актыўная работа. Ва ўмовах фактычнай блакады беларускага экспарту Расія забяспечвае перавалку шырокага спектра нашых грузаў на рынкі трэціх краін. Толькі за дзевяць месяцаў транзіт беларускіх грузаў праз расійскія парты павялічыўся ў 2,2 раза. Для апрацоўкі беларускага экспартнага грузу задзейнічана 14 партоў Расійскай Федэрацыі».*

# ЗІМА? ДЫК ГЭТА Ж ЗДОРАВА!



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Учора на ўсходзе краіны насыпала шмат снегу. І калі для дарослых гэта лішнія клопаты, дык для дзяцей — прыемныя ўражанні. Першакласніца Грабаўскай сярэдняй школы Гомельскага раёна Мілена ВАСКУН такой ранняй зіме вельмі рада.

Імпартазамяшчэнне

## «БелДжы» выпускае 15 машын за гадзіну

### А з пачатку вытворчасці на заводзе рэалізавана 100 тысяч аўтамабіляў



**Роўна пяць гадоў таму ў Барысаўскім раёне пачаў абкатку новы завод — «БелДжы». Выйсці на рынак легкавога аўтапрама ў адзіночку і не прагарэць — задача не з простых. Беларусь заручылася падтрымкай кітайскіх партнёраў. Тэхналогіі з гэтай краіны, а зборка наша. Як аказалася, такая звязка — гарантыя на поспех. Напярэдадні 5-годдзя прадпрыемства спецыялісты «БелДжы» расказалі пра тое, што чакае айчынны аўтапрам і аўтарынак у цэлым на фоне эканамічных санкцый, магчымага лакдаўна ў Кітаі і іншых фактараў, з якімі сутракаюцца сёння нашы грамадзяне і пакупнікі з суседняй Расіі.**

СТАР. 4

Сезон

## КАВАРНЫ ПЕРШЫ СНЕГ І ГАЛАЛЁД

### Як засцерагчыся ад падзенняў і траўм?

**Зіма сёлета парадавала першым снегам у другой палове лістапада. А з яе надыходам дадалося работы ў траўматолагаў. Паводле іх прызнання, пацыентаў з выпадзеннем снегу і галалёдам становіцца ўдвая, а то і ўтрая больш. І віной таму наша неасцярожнасць: за лета мы адвыклі ад «зімовай» плаўнай хады. А таксама нашы паспешлівасць і непадыходзячы абутак — менавіта яны найчасцей становяцца прычынамі траўмаў. Пра асноўныя правілы бяспекі на вуліцы (і падчас выбару абутку), якія дапамогуць не трапіць на бальнічны ложак, а таксама — як навучыцца правільна падаць і ўставаць, расказалі спецыялісты.**

СТАР. 5

## КОРАТКА

- **«Расатам» паставіць медабсталяванне для лячэння анказахворванняў у Беларусь.**
- Мінфін пачаў прадаваць зліткі золата беларускай вытворчасці.
- **У МПЗ нагадалі аб неабходнасці інвентарызацыі астаткаў велатавараў па стане на 1 снежня 2022 года.**

ISSN 1990 — 763X

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



# ДЗЕЙНАСЦЬ АДКБ АБМЯРКУЮЦЬ У ЕРЭВАНЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка здзяйсняе рабочы візіт у Арменію, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Сёння ў Ерэване кіраўнік дзяржавы прыме ўдзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Мерапрыемства пройдзе ў вузкім і пашыраным саставах.

Лідары краін абмяркуюць актуальныя праблемы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, асноўныя вынікі дзейнасці АДКБ у міжсесіённы перыяд. Удзельнікі саміту таксама разгледзяць шырокі спектр пытанняў, якія датычацца розных сфер і напрамкаў узаемадзеяння.

З улікам пераходу старшынства ў АДКБ да Беларусі ў 2022—2023 гадах Аляксандр Лукашэнка агучыць прыярытэтныя напрамкі, на якіх у гэты перыяд трэба будзе сканцэнтраваць сумесныя намаганні.

# АДНОСІНЫ, ЗАСНАВАНЫЯ НА СЯБРОЎСТВЕ І ПАДТРЫМЦЫ

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА правёў рабочую сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кубы ў Беларусі

**Перш чым абмеркаваць двухбаковае супрацоўніцтва і вызначыць планы на перспектыву, спікер ніжняй палаты парламента павіншаваў Санцьяга Перэса Бенітэса з афіцыйным пачаткам дыпламатычнай місіі ў Беларусі. Як інфармаваны Уладзімір Андрэйчанка, пасол ужо вельмі актыўна ўключыўся ў работу, устанавіў многія кантакты з нашымі дзелавымі коламі. Ужо не раз быў і ў Палацы прадстаўнікоў.**



Фота БелТА.

«Сёлета мы адзначылі 30-годдзе з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі, — адзначыў спікер ніжняй палаты. — Але трэба прама сказаць, што нашы адносіны маюць больш глыбокія карані. Яны заўсёды будаваліся на аснове сяброўства, узаемаразумення, падтрымкі. І, вядома ж, у гэты няпросты час, калі і ў дачыненні да Кубы з боку Злучаных Штатаў Амерыкі працягваюцца санкцыйныя спробы (фінансавая, гандлёвая, эканамічная блакады), у дачыненні да Рэспублікі Беларусь адбываецца тое ж самае з боку калектыўнага Захаду, Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэтыя краіны хацелі б, каб у нас была дэстабілізавана абстаноўка, дыскрэдытуецца палітыка, якая праводзіцца ў Беларусі. Нам важна ў гэты час падтрымліваць актыўны палітычны дыялог і больш інтэнсіўна развіваць нашы гандлёва-эканамічныя адносіны».

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, адчувальны імпульс супрацоўніцтву далі сустрэчы прэзідэнтаў дзвюх краін. «Вельмі важна, што сёлета ў чэрвені адбылося пасяджэнне сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў Гаване, — заўважыў ён. — Былі намечаны рэальныя пазіцыі, мерапрыемствы, якія мы павінны ажыццявіць. І ёсць такая канчатковая мэта, што ўзаемныя пастаўкі павінны выйсці на канец года прыкладна на 60 — 30 мільёнаў долараў з кожнага боку. Гэта важна. Больш за тое, гэта ўсё рэальна».

У баку ад гэтага не будуць заставацца і дэпутаты. Як падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка, у цэлым парламентарыі Беларусі высока цэняць тыя сяброўскія адносіны, якія ў нас склаліся з Кубай.

«Ёсць аб'ектыўны патэнцыял для развіцця нашых адносін: і па лініі экспарту Кубы сюды, і па лініі імпарту з Беларусі, — звярнуў увагу **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кубы ў Беларусі Санцьяга Перэс БЕНІТЭС**. — На Кубе ёсць каля 70 тысяч трактароў МТЗ, якія трэба абслугоўваць. Тут ёсць вялікі патэнцыял. Калі казаць аб грузавіках МАЗ, гэта таксама вялікі патэнцыял».

Пасол заўважыў, што ў Палацы прадстаўнікоў адносна да Кубы заўсёды дружалюбна настроены. «Я нават сказаў бы, што гэта брацкія сувязі, — заявіў ён. — Сапраўды, паразуменне ідзе па ўсіх напрамках. Пасля COVID-19 намеціўся ўздым нашых адносін і заўважна зацікаўленасць з беларускага і кубінскага боку. Я ўжо паспеў пабываць у абласцях Беларусі, засталося наведаць толькі Гродна. У мяне склаліся цудоўныя адносіны з МЗС, Мінсельгасхарчам, Міністэрствам прамысловасці, а таксама па лініі прадпрымальніцкіх колаў».

**Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# У АДПАВЕДНАСЦІ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМІ ІНТАРЭСАМІ

## Якія змяненні чакаюць заканадаўства аб палітычных партыях і грамадскіх аб'яднаннях?

**Абноўленая Канстытуцыя і прыняцце Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» патрабуе карэкціроўкі многіх заканадаўчых актаў. Не сталі выключэннем і Законы «Аб палітычных партыях» і «Аб грамадскіх аб'яднаннях». Якія прынцыпова новыя моманты закрануць дзейнасць палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў і наколькі яны адпавядаюць сучасным рэаліям, а самае галоўнае, ці разлічаны на будучыню, парламентарыі, прадстаўнікі грамадскасці, палітолагі і навукоўцы абмеркавалі падчас круглага стала «Роля грамадскіх аб'яднанняў у палітычнай сістэме Рэспублікі Беларусь. Заканадаўства і шляхі яго ўдасканалення», які адбыўся па ініцыятыве Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі і рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».**

### Удасканаленне заканадаўства

Як расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Генадзь ДАВЫДЗЬКА**, неабходна навесці парадак у той сферы, якую мы называем грамадзянскай супольнасцю і ўвогуле палітычным плюралізмам, даць большую свабоду для палітычнага волевыяўлення людзей. «Мы пераканаліся на не такіх ужо даўніх падзеях, што лепш не на плошчах высвятляць адносіны, а на полі палітычных партый, дыскусій, на аснове круглых сталоў, абмену меркаваннямі», — заўважыў ён.

У камісію наконт законапраекта аб палітычных партыях і грамадскіх аб'яднаннях прыходзіць нямала зваротаў і прапаноў. Людзей хвалюе некалькі пазіцый: колькасць членаў палітычных партый, якія патрэбна зарэгістраваць, іх рэгіянальная прысутнасць, справаздачнасць партый і грамадскіх аб'яднанняў перад Міністэрствам юстыцыі, адкрытасць і галоснасць існавання грамадскіх аб'яднанняў і партый.

Па словах Генадзя Давыдзькі, прымаць законапраект неабходна ўзважана, скрупулёзна, выслухаць меркаванні ўдзельнікаў гэтага палітычнага працэсу. «Размова ідзе аб стабільнасці нашай палітычнай будучыні, магчымасці свабоднага волевыяўлення ў прававым полі грамадзян, — акцэнтаваў увагу парламентарый. — Гэта вельмі важна. У той час як увесь свет страчвае бачнасць дэмакратыі, мы, наадварот, нарошчваем гэтыя інстытуты».

### Актыўнасць — на карысць краіне

Свае прапановы аб змяненні заканадаўства аб палітычных партыях і грамадскіх аб'яднаннях унесла і рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь». Як расказаў яго **старшыня, член Савета Рэспублікі Алег РАМАНАЎ**, яны датычацца неабходнасці павышэння мінімальнай колькасці членаў палітычнай партыі, іх больш поўнай прадстаўленасці ў рэгіёнах нашай краіны — для таго, каб палітычныя партыі былі рэальнымі палітычнымі сіламі, якія, па-першае, атрымліваюць падтрымку вялікіх сацыяльных груп, а па-другое, могуць уплываць на палітычныя працэсы.

Па словах Алега Раманава, тое, што палітычныя партыі пры ўсіх сваіх ідэалагічных разыходжаннях павінны стаяць на канструктыўнай, стваральнай, прадзяржаўнай і пранароднай пазіцыі, знайшло адлюстраванне ў законапраекце аб палітычных партыях і грамадскіх аб'яднаннях. «Непарушнай з'яўляецца ідэя аб тым, што арыенцір Рэспублікі Беларусь безумоўны, ніхто не мае права пасягаць на тэрытарыяльную цэласнасць, незалежнасць беларускай дзяржавы, і палітычныя партыі павінны забяспечваць гэтыя найвышэйшыя каштоўнасці беларускай дзяржавы і грамадства», — падкрэсліў ён.

Па перакананні старшыні РГА «Белая Русь», грамадзянская супольнасць Беларусі мае патрэбу ў грамадскіх аб'яднаннях, палітычных партыях, якія маглі б накіроўваць стваральную энергію грамадзян, падтрымліваць канструктыўныя ініцыятывы, выказваць інтарэсы людзей. «І мы, працуючы з людзьмі ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны, з усімі сацыяльнымі групамі, бачым, што грамадства зацікаўлена ў супольнасцях, групах адзінства, якія будуць выказваць нацыянальныя інтарэсы, — заўважыў Алег Раманаў. — «Белая Русь» цалкам рэалізоўвае гэтую задачу і накіроўвае энергію людзей, іх стваральную актыўнасць на карысць Рэспублікі Беларусь, яе росквіт».

### Узмацненне ролі грамадзян

Аб некаторых новаўвядзеннях праекта Закона «Аб змяненнях законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў» расказаў **намеснік міністра юстыцыі Алег КОТ.** Ён звярнуў увагу на тое, што палажэнні, якія ўтрымліваюцца ў праекце закона, паслядоўна працягваюць падтрыманую народам на рэферэндуме па Канстытуцыі ідэю аб выбудоўванні ў Беларусі прававой асновы для развіцця грамадзянскай супольнасці і партыйнай сістэмы, што адпавядаюць нацыянальным інтарэсам, накіраваныя на стабільнасць. «Вынікам заканадаўчых мер, якія прапаноўваюцца, павінна стаць узмацненне ролі грамадзян у палітычным жыцці краіны, выбудоўванне зразумелых для ўсіх канфігурацый грамадзянскай супольнасці, — падкрэсліў Алег Кот. — Разумеючы, што грамадзянская супольнасць — гэта сістэма, якая пастаянна мяняецца, дзяржаўная ўлада павінна адпавядаць ёй на кожным новым этапе развіцця».

У прыватнасці, праектам закона прапаноўваецца замацаваць універсальныя агульныя мэты і задачы, якія павінны быць адлюстраваны ў статутах палітычных партый. Палітычная партыя, якая вядзе тэрарыстычную і іншую забароненую заканадаўствам дзейнасць або тую, якая наносіць шкоду дзяржаве, падлягае ліквідацыі. Асновай для ліквідацыі можа стаць і атрыманне грашовых сродкаў або маёмасці з замежных крыніц. Прапануецца, што заснавальнікамі і членамі партый могуць быць не толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь — яны павінны яшчэ і пастаянна пражываць у нашай краіне. «Дадзенае дапаўненне абумоўлена тым, што гэтыя грамадзяне здольныя больш свядома ацэньваць палітычную сітуацыю ў дзяржаве, — удакладніў намеснік міністра юстыцыі. — Норма, якая прапаноўваецца, у пэўнай ступені таксама дазволіць пазбегнуць знешняга ўплыву на дзейнасць партый».

На працягу трох месяцаў з дня ўступлення ў сілу закона партыям неабходна будзе забяспечыць прадстаўленне ў Міністэрства юстыцыі дакументаў для перарэгістрацыі з улікам новых патрабаванняў або прыняць рашэнне аб ліквідацыі. У шасцімесячны тэрмін з дня ўступлення ў сілу закона партыі павінны прайсці перарэгістрацыю. У іншым выпадку, паводле рашэння Вярхоўнага суда, яны спыняць сваю дзейнасць.

Што датычыцца новаўвядзенняў па пытанні дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, Алег Кот расказаў, што законапраектам змяняецца вызначэнне грамадскага аб'яднання. «Устанаўліваецца, што ім з'яўляецца добраахвотнае аб'яднанне грамадзян, якія ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку аб'ядналіся на аснове агульнасці інтарэсаў для ажыццяўлення сацыяльных, эканамічных, культурных і іншых інтарэсаў, — удакладніў ён. — Прадугледжваецца пашырэнне тэрытарыяльнай прысутнасці для рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў. Для міжнародных грамадскіх аб'яднанняў устанаўліваецца неабходнасць мець структуры не толькі за мяжой, але і на тэрыторыі Беларусі».

Будзе спрошчаны парадак атрымання юрыдычнага адраса грамадскімі аб'яднаннямі і іх структурамі. Грамадскія аб'яднанні, мяркуецца, будуць мець права ўдзельнічаць у рабоце грамадскіх кансультатыўных саветаў, якія ствараюцца пры дзяржаўных органах. «Прапанаваныя заканадаўчыя падыходы, з аднаго боку, дазволяць вывесці на больш высокі ўзровень развіццё партыйнага будаўніцтва і грамадзянскай супольнасці ў нашай краіне, з другога — актывізуюць работу аб'яднанняў, павысяць эфектыўнасць і канструктыўнасць узаемадзеяння з органамі дзяржаўнай улады, — перакананы намеснік міністра. — Усе суб'екты грамадзянскай супольнасці павінны разумець сваю долю адказнасці і дзейнічаць у межах закона».

Як адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ**, палітычная партыя павінна стаць палітычнай сілай. «Мы павінны людзям патлумачыць, чаму вядзём размову аб павелічэнні колькасці членаў палітычнай партыі, — заўважыў дэпутат. — Не таму, што мы не хочам дэмакратызаваць палітычны працэс і не таму, што баімся палітычнай канкурэнцыі. Калі партыя прайшла перарэгістрацыю або зарэгістравалася па новым заканадаўстве — гэта сапраўды палітычная сіла, якая з сябе нешта ўяўляе».

Па словах Алега Гайдукевіча, неабходна дакладна раздзяляць заканадаўства аб палітычных партыях і грамадскіх арганізацыях. «Для палітычнай партыі патрабаванні павінны быць больш жорсткія, — лічыць парламентарый. — Чаму? Палітычная партыя змагаецца за ўладу. І раз так — будзьце ласкавы выконваць больш жорсткія патрабаванні заканадаўства».

**Вераніка КАНЮТА.**

Кантэкст

# «ТАКІ «ДАГАВАРНЯК», ШТО ДАЛЕЙ НЯМА КУДЫ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што інцыдэнт з падзеннем ракеты на тэрыторыі Польшчы падобны на «дагаварняк». Гэту тэму ён закрануў падчас сустрэчы з кіраўніком Удмурцкай Рэспублікі Аляксандрам Брачалавым.**

## Пытанні без адказу

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ніхто не задаецца і не дае адказу на шэраг пытанняў. «Трэба на элементарныя пытанні адказаць. Чаму менавіта ў час саміту «дваццаткі» раптам атакавалі натаўскую дзяржаву, як гэта было першапачаткова прадстаўлена. Ведаеце, я баюся рабіць высновы, але падобна на такі «дагаварняк», што далей няма куды. Але крыху не разлічылі — людзі загінулі. Кіраўніцтву Польшчы трэба адказаць перад палякамі, як магло так здарыцца, чаму білі па тэрыторыі Польшчы, хто дамовіўся, чаму ракета раптам з усходу на захад завярнула і паляцела і чаму ў той момант стралялі, калі ў паветры не было расійскіх ракет. Вось на гэтыя пытанні трэба адказаць, і ўсё стане зразумела», — сказаў беларускі лідар.

У сувязі з гэтай сітуацыяй ён у станоўчым ключы адзначыў рэакцыю Прэзідэнта ЗША Джо Байдэна: «Малайчына. Джо Байдэн. Яму трэба аддаць належнае, што ён сумлення сказаў: «Выбачайце, не расійская». «Цяпер супраць нас ідзе жорсткая вайна, схватка. І вось гэты прыклад паказвае. Апякліся і хуценька спрабуюць закрыць гэту тэму. Ужо яна на Захадзе амаль і не абмяркоўваецца. Ну, значыць, гэта толькі пачатак. І яны шкадуюць, палякі і ўкраінцы, што гэта не расійская ракета, якая ляцела. Ім трэба нас справакаваць, патрэбна эскалацыя», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

## Аб'ектыўныя даныя

Прэзідэнт Беларусі паставіў абсалютна слушныя пытанні, адзначыў палітычны аналітык Аляксандр Шпакоўскі ў эфіры «Альфа Радыё». «Як толькі з'явілася інфармацыя аб бамбардзіроўцы Польшчы, першапачаткова адна з версій ваенных экспертаў і палітычных аналітыкаў заключалася ў тым, што гэта была самадзейнасць спецслужбаў Украіны — правакацыя, загадзя абумоўленая з іх польскімі калегамі з мэтай пашырэння геаграфіі канфлікту і ўцягвання ў яго НАТА», — зауважыў Аляксандр Шпакоўскі.

Аналітык звярнуў увагу на той факт, што «многія краіны Паўночнаатлантычнага альянсу не хочуць удзельнічаць у гэтым канфлікце і ўсяляк спрабуюць адмежавацца ад яго нават пад ціскам амерыканцаў».

— Сапраўды, шмат што паказвае на тое, што гэта магла быць нейкая дамоўленасць. Акрамя таго, трэба сказаць, што Прэзідэнт жа абапіраўся не проста на нейкія гіпотэзы. Кіраўнік дзяржавы абапіраўся на аб'ектыўныя даныя кантролю паветранай прасторы, якія ажыццяўляе наша сістэма СПА, — падкрэсліў Аляксандр Шпакоўскі. — Мы ведаем, што ў рамках Саюзнай дзяржавы менавіта Беларусь адказвае за напрамак паўночнага захаду, наша СПА кантралюе і неба над Беларуссю, і пэўную прастору за яе межамі — мы можам бачыць яго, ёсць даныя. Гэтай інфармацыяй падзяліліся з расійскімі калегамі, пры неабходнасці яе абнародуюць. Таму Прэзідэнт дакладна ведае, што гэта была ўкраінская ракета. У прынцыпе, у гэтым ніхто зараз у свеце не сумняваецца.

## Цікавыя моманты

У сітуацыі з ракетай, якая ўпала на тэрыторыі Польшчы, цяпер пытанняў больш, чым адказаў. Такі пункт гледжання БелТА выказаў ваенны аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Андрэй Чарнабай. «Падобна, што мы насамрэч з'явіліся сведкамі спробы стварэння штучнага крызісу, вынікам якога павінна была стаць эскалацыя напружанасці ў зоне канфлікту і нават, магчыма, пашырэнне самой гэтай зоны, уцягванне ва ўзброеное супрацьстаянне новых краін, аж да прамога сутыкнення Расіі з блокам НАТА. «Добра, што розум над эмоцыямі на гэты раз перамог і эскалацыі ўдалося пазбегнуць», — адзначыў аналітык, каментуючы заявы Прэзідэнта Беларусі. Каб паспрабаваць адказаць на ўзніклыя пытанні, у тым ліку вызначыць, каму гэта было больш за ўсіх выгадна, трэба ўважліва ацаніць абстаноўку, на фоне якой адбыўся інцыдэнт, лічыць Андрэй Чарнабай. Паводле яго слоў, справа не толькі ў правядзенні саміту G20 на Балі, фармат якога змяніўся і стаў накіраваны на чарговае асуджэнне Расіі.

Эксперт звярнуў увагу і на іншыя цікавыя моманты. Напрыклад, на тое, што на наступны дзень пасля падзення ракеты ў планавым парадку праводзілася чарговае пасяджэнне кантактнай групы па абароне Украіны пад старшынствам міністра абароны ЗША Лойда Осціна і з удзелам генеральнага сакратара НАТА Енса Столтэнберга. Прадстаўнікі некалькіх дзясяткаў краін вырашалі, якое ўзбраенне неабходна паставіць Кіеву ў найбліжэйшы час у першачарговым парадку. Самае характэрнае, на думку Андрэя Чарнабоя, тут тое, што Украіна даўно запытвала дадатковыя сродкі супрацьпаветранай і супрацьракетнай абароны і гэтыя просьбы на пасяджэнні былі задаволены.

Таксама аналітык БІСД адзначыў, што літаральна за месяц да інцыдэнту, 13 кастрычніка, падчас сустрэчы міністраў абароны НАТА ў Брусэлі была вылучана ініцыятыва па стварэнні «Еўрапейскага нябеснага шчыта», якая прадугледжвае сумесную закупку перадавых сістэм супрацьпаветранай абароны, якія змаглі б абараніць тэрыторыю еўрапейскіх краін ад магчымых ракетных нападаў. Ініцыятыва была падтрымана 14 дзяржавамі — членамі НАТА, а таксама Фінляндыяй. У гэтую групу, апроч шэрагу цэнтральнаеўрапейскіх, увайшлі практычна ўсе краіны, размешчаныя на ўсходнім флангу Паўночнаатлантычнага альянсу, — Эстонія, Латвія, Літва, Чэхія, Славакія, Венгрыя, Славенія, Румынія і Балгарыя. Адмовілася толькі Польшча, якая была пераканана ў эфектыўнасці ўласнай сістэмы супрацьпаветранай абароны.

Андрэй Чарнабай задаўся пытаннем, навошта да расследавання інцыдэнту трэба прыцягваць краіны, якіх дадзенае здарэнне абсалютна не закранула, напрыклад краіны Балтыі. Эксперт падкрэсліў, што, верагодна, пройдзе яшчэ нямала часу, перш чым тэма з ракетай, якая ўпала на тэрыторыю Польшчы, перастане абмяркоўвацца на міжнародных форумах і сыдзе з першых палос СМІ. «Значыць, і інфармацыйная хваля таксама мае свайго беніфіцыяра», — лічыць Андрэй Чарнабай.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ТВОРЧЫ КОД ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

### Палац Рэспублікі і Прэзідэнцкі аркестр адзначаюць юбілеі

**Сёлета сваё 25-годдзе адзначае дзяржаўная ўстанова «Палац Рэспублікі», і 20 гадоў спаўняецца Прэзідэнцкаму аркестру Рэспублікі Беларусь. Дзве юбілейныя даты адзначаць 25 лістапада вялікай канцэртнай праграмай з удзелам вядомых артыстаў. А вось пра адметныя старонкі сучаснага існавання двух калектываў іх прадстаўнікі расказалі на сустрэчы ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**

— Юбілейныя даты былі ў нас і раней, але на гэты раз мы вырашылі дадаць крыху сімвалізму і адзначыць іх 25 лістапада. Святкаванне будзе яркім. Двухгадзінны канцэрт з удзелам зорак, маладых выканаўцаў. Вельмі прыемна, што на наша запрашэнне адгукнуліся ў тым ліку і расійскія артысты, з якімі ў нас сяброўскія адносіны. Некаторыя нават змянілі свае гастрольныя графікі, каб прыехаць і быць разам з намі ў такі дзень, — дзеліцца **дырэктар ДУ «Палац Рэспублікі» Максім ПРЫХАДОЎСКІ.** — Некалі мы пачыналі з невялікіх мерапрыемстваў у Малой зале. І вось на працягу свайго дынамічнага развіцця Палац Рэспублікі стаў адным са значных арганізатараў мерапрыемстваў не толькі на пляцоўках нашай установы, але і ў «Мінск-Арэне», Палацы спорту і іншых, прычым як у нашай краіне, так і за яе межамі. Палац Рэспублікі за чвэрць стагоддзя ні на імгненне не спыніў сваю дзейнасць. Мы супрацоўнічаем не толькі з замежнымі артыстамі, але і з беларускімі. Увогуле, наша філасофія — стварэнне камерцыйна цікавага прадукту шоу-бізнесу для нашага гледача.

Аднак асаблівы гонар для канцэртнай установы — тое, што ў іх штаце сёння працуе Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь. Прычым, як адзначыў суразмоўца, гэты заслужаны калектыў — сёння адзіны пратакольны аркестр у свеце (да гэтага быў Лонданскі сімфанічны аркестр, што лічыўся каралеўскім і вёў пратакольныя мерапрыемствы), які таксама займаецца арганізацыяй і правядзеннем канцэртных мерапрыемстваў, не звязаных з пратаколам.

— Гэта вельмі важны нюанс, бо кожнаму музыканту хочацца развівацца. І ў аркестры мы пачалі ствараць той музычны прадукт, які сёння запатрабаваны на рынку. Разнажанравыя праграмы мы прадстаўляем у Вялікай зале. Ёсць нават пастаянныя наведвальнікі, хто ходзіць непасрэдна на Прэзідэнцкі аркестр. У пэўнай меры гэта і вынік нашай зваротнай сувязі праз сацыяльныя сеткі, рэпутацыя, што напрацоўвалася за працяглы час, — зазначае Максім Анатольевіч.



— Я прыйшоў у гэты калектыў трэцім патокам. І, назіраючы за тым, што робіць кіраўнік дзяржавы, які падпісаў распараджэнне аб стварэнні Прэзідэнцкага аркестра, я разумеў, што нам, музычным артыстам, музыкантам, выпускнікам вядучых ВНУ, якія вытрымалі конкурс у аркестр, выпаў вялікі гонар і вялікая адказнасць — нам досталася самая галоўная музычная пляцоўка — залы Палаца Рэспублікі, дзе мы паспяхова выступаем ужо дваццаць гадоў, — адзначае **галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь Віталь КУЛЬБАКОЎ.** — Дзякуючы гэтай падтрымцы мы, маладыя беларускія музыканты, атрымалі каласальны вопыт, працуючы з артыстамі як замежнай, так і беларускай эстрады. Сёння заслужаны калектыў здольны выканаць любую музычную мастацкую задачу. Яму падуладныя ўсе стылі і жанры. І тое стала магчымым дзякуючы нашай працы з такімі майстрамі, як Эніа Марыконэ, Дзмітрый Хварастоўскі, Мішэль Легран і іншымі. Працуючы з гэтымі вялікімі музыкантамі, мы ўбіралі ў сябе ўсё тое найлепшае, што яны нам аддавалі.

У планах калектыву — працягваць рэалізоўвацца ў розных напрамках, але ў прыярытэце, вядома, праца, якая дазваляе падтрымліваць сваё, беларускае, музычнае мастацтва і артыстаў, а таксама стварэнне канцэртных праграм, якія будуць цікавыя іх аўдыторыі. Напрыклад, ёсць жаданне працягваць лінейку рокавых канцэртаў, сканцэнтраваўшыся менавіта на расійскім яго сегменце.

**Алена ДРАПКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кіраўнік Прыднястроўя паскардзіўся ў ААН з-за крызісу з Малдовай

**Лідар непрызнанага Прыднястроўя Вадзім Краснасельскі звярнуўся да ААН і АБСЕ з-за крызісу ў адносінах з Кішынёвам і пагрозы гуманітарнай катастрофы, перадае ТАСС.**

Краснасельскі заклікаў кіраўніцтва міжнародных арганізацый прыняць меры для недапушчэння гуманітарнай катастрофы ў рэспубліцы. Палітык падкрэсліў, што ў першую чаргу неабходна аказаць ціск на Малдову з тым, каб яна выканала свае кантрактныя абавязацельствы па пастаўках газу ў рэгіён.

Таксама Краснасельскі ў лісце да ААН і АБСЕ папрасіў дапамагчы аднавіць прамы дыялог Малдавіі з Расіяй і Украінай па ўрэгуляванні газавага пытання і аднаўленні паставак расійскага газу на ранейшым узроўні.

Раней паведамлялася, што Прыднястроўе звярнулася да Расіі для вырашэння праблемы адбору газу ў рэспубліцы Малдовай. Па словах кіраўніка МЗС непрызнанай рэспублікі Віталя Ігнацьева, Кішынёў адбірае ў Прыднястроўя газ і назапашвае, «бо такія вялікія аб'ёмы газу Малдове фактычна не патрэбныя».

### Пяскоў параўнаў сённяшнюю сітуацыю з Карыбскім крызісам

**Прэс-сакратар Прэзідэнта РФ Дзмітрый Пяскоў заявіў, што бягучая сітуацыя і Карыбскі крызіс у 1962 годзе ўяўляюць сабой «сутыкненне» Расіі з калектыўным Захадам на чале з ЗША.**

Адказваючы на пытанні журналістаў аб тым, ці будзе тэма 60-годдзя Карыбскага крызісу абмяркоўвацца на сустрэчы прэзідэнтаў Расіі і Кубы Уладзіміра Пуціна і Мігеля Дыяс-Канеля, прадстаўнік Крамля ўказаў, што бягучая сітуацыя і мінулыя падзеі «розныя».

«Хоць і тады, і цяпер гаворка ідзе пра сутыкненне нас і калектыўнага Захаду на чале з ЗША. Гэты элемент падобны, але нюансы розныя», — растлумачыў Пяскоў.

Паводле яго слоў, Карыбскі крызіс «не галоўнае» на будучых перагаворах двух лідараў. «Расійска-кубінскія адносіны маюць добры задзел у сучаснасці і перспектывы ў будучыні», — дадаў прадстаўнік расійскага прэзідэнта.

### Меган Маркл і прынц Гары атрымаюць узнагароду за барацьбу з расізмам у каралеўскай сям'і

**Меган Маркл і прынц Гары атрымаюць узнагароду за тое, што кінулі выклік расізму ў каралеўскай сям'і. Пра гэта паведамляе Mirror.**

Герцаг і герцагіня Сасэкскія ўзнагароджаны прэстыжнай прэміяй Роберта Ф. Кенэдзі Ripple of Hope Award за выклік «структуры ўлады». Пляменніца Джона Кенэдзі Кэры Кенэдзі, якая будзе весці цырымонію ўзнагароджання, сказала, што Меган і Гары занялі смелую пазіцыю



ў дачыненні да манархіі, ведаючы, што ў выніку іх падвергнуць астракізму.

«Меган і Гары ведалі: калі яны гэта зробяць, то будуць наступствы, што іх падвергнуць астракізму, яны страцяць сваю сям'ю, сваё становішча ў гэтай структуры і што людзі будуць іх вінаваціць. Але яны ўсё роўна зрабілі гэта. Я думаю, яны праявілі гераічнасць, зрабіўшы такі крок», — цытуе словы Кэры Кенэдзі выданне Mirror.

Герцаг і герцагіня Сасэкскія атрымаюць узнагароду на гала-вечары Ripple of Hope Gala, які пройдзе ў Нью-Ёрку 6 снежня. Раней паведамлялася, што білеты на вячэру з удзелам прынца Гары і Меган Маркл прадаюць за $1 млн.

# «БелДжы» выпускае 15 машын за гадзіну

## ГЭТА ЎЖО СУР'ЁЗНЫ БРЭНД

Як адзначыў **генеральны дырэктар прадпрыемства Генадзь СВІДЗЕРСКІ**, у канцы лістапада 2017 года Прэзідэнт даў старт вытворчасці. Падводзячы вынікі працы за гэты час, можна сказаць, што завод выйшаў на вытворчыя магутнасці, якія былі запланаваны. «Мы сёння працуем у рэжыме 15 машын за гадзіну. Цяпер плануем нашу працу, выходзячы з заказаў, што забяспечваюць стабільную работу завода».

Гаворачы аб мадэльным радзе завода, Генадзь Свідзерскі падкрэсліў, што за пяць гадоў не толькі нарошчваліся аб'ёмы вытворчасці, але і асвойваліся новыя мадэлі.

Пяць гадоў таму кампанія пачынала з флагманскай мадэлі Atlas, а ўжо ў 2022 годзе мае ў мадэльным радзе шэсць аўтамабіляў. Рынак патрабаваў, каб мы пастаянна абнаўлялі вытворчую лінейку. Atlas Pro і Coolray цяпер складаюць аснову плана вытворчасці і рэалізацыі.

Звяртаючы ўвагу на работу завода, ён адзначыў, што прадпрыемства на выніках дзесяці месяцаў мае рэнтабельнасць 5,9 %.

— У нас склаліся суадносіны: 80 працэнтаў — экспарт, 20 працэнтаў — айчынны рынак. Мы падрыхтаваліся і будзем рабіць усё магчымае, каб у нашых салонах быў поўны мадэльны рад аўтамабіляў. У нас за гады працы з'явілася 10 салонаў па краіне, 17 аўтарызаваных сэрвісных цэнтраў. Такім чынам, створана дастатковая інфраструктура, каб камфортна выкарыстоўваць нашу тэхніку.

## У КАНЦЫ ГОДА РАБОТА «КІПІЦЬ»

Гэты год для аўтапрама быў складаным, лічыць гендырэктар. Нягледзячы на гэта, на прадпрыемстве з пачатку года выраблена і рэалізавана 17 тысяч аўтамабіляў (з іх 14 тысяч прададзена ў Расіі). А ўсяго да канца года мы плануем рэалізаваць 25 тысяч аўто. «Так што, лістапад і снежань для нас гарачыя месяцы, мы павінны выпрацаваць практычна ў два разы больш, чым летам», — сказаў Генадзь Свідзерскі.

«Рэжым работы завода цяпер пераведзены на 7-дзённы тыдзень і 12 гадзін на дзень. Выходзім з патрэбы і існуючых магчымасцяў паставак», — дадаў гендырэктар прадпрыемства.

## МІНУС ЛІТВА, ПЛЮС — УЛАДЗІВАСТОК

«Праблемы, над вырашэннем якіх мы зараз працуем, — гэта і лагістыка, і дэфіцыт чыпаў, які па-ранейшаму суправаджае аўтамабільную вытворчасць. Акрамя таго, гэта і лакдаўны, якія аб'яўляюцца час ад часу ў Кітаі з-за пандэміі. Але ў гэтым і складаецца задача, каб знайсці шлях ўстойлівага развіцця ў новых умовах», — адзначыў Генадзь Свідзерскі.

Ён звярнуў увагу, што наладзіць пастаўкі камплектуючых у сённяшніх умовах было няпростай справай. «Ящчэ не ўсе цяжкасці пераадоленыя. Прыйшлося цалкам памяняць усе лагістычныя ланцужкі. Калі мы раней ішлі праз Літву, то зараз ідзём праз Казахстан, Расію, гэта значыць — больш выкарыстоўваем парты Уладзівастока, чыгунку. Каб наладзіць гэтыя патокі, спатрэбіўся час. Цяпер у нас рытмічныя пастаўкі», — падкрэсліў гендырэктар. Пры гэтым ён адзначыў, што наладзіць пастаўкі камплектуючых было няпроста.

Гаворачы аб пытанні выплат па прыцягнутых крэдытах па будаўніцтва завода, ён адзначыў, што практычна палова сумы ўжо вернутая ва ўстаноўленыя тэрміны.

## ЦЭНЫ РЭГУЛЮЮЦЦА ПОПЫТАМ І ПРАПАНОВАЙ

«Чым большым будзе напаўненне рынку, тым меншым будзе кошт. Таксама важныя эфектыўныя і зразумелыя лагістычныя схемы пастаўкі, таму што гэта адбіваецца на тэрмінах і цэнах. А яны выстройваюцца па-новаму, што патрабуе часу і падрыхтоўкі. Цяпер адбываецца адладка гэтых працэсаў», — сказаў Генадзь Свідзерскі.

«Наша задача — насыціць рынак, тады цэны пойдуць уніз. Адначасова трэба адладзіць і ланцужкі выдаткаў. Адна справа — вырабляць адну тысячу машын за месяц, другая — чатыры тысячы, як мы зрабілі ў гэтым месяцы. Той жа калектыў, але ўжо ў чатыры разы больш тавару», — адзначыў гендырэктар прадпрыемства.

Ён таксама звярнуў увагу, што завод па асноўных мадэлях уводзіць летнія зніжкі, якія падоўжаныя да канца года. «Я нават сказаў бы, што не проста працягнулі, а фіналізавалі ў кошце гэтых аўтамабіляў. Таму мы не плануем павышэння цэн. Будзем да канца года іх захоўваць. Што датычыцца наступнага года, цяпер у нас вядуцца перамовы з кампаніяй Geely, мы вызначаем мадэльны рад, аб'ёмы, вышэйшыя за ўзровень гэтага года. Цэны на наступны год мы будзем гатовыя назваць у снежні, зыходзячы з зацверджанага плана вытворчасці і продажаў і мэтавых паказчыкаў, якія зацвердзяць акцыянеры», — дадаў Генадзь Свідзерскі.

У той жа час **старшыня праўлення Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі (БАА) Сяргей ВАРЫВОДА** лічыць, што сёлета аўтамабільны рынак Беларусі знаходзіцца пад моцным ціскам як з боку фактараў попыту, так і з боку фактараў прапановы. «Мы назіраем «ідэальны шторм». У той жа час «БелДжы» моцна трымае ўдар. Нягледзячы на тыя выклікі, з якімі сутыкнуўся аўтамабільны рынак, з чэрвеня гэтага года марка Geely — абсалютны лідар продажаў у сегменце новых легкавых аўтамабіляў і нарошчвае сваю перавагу», — сказаў Сяргей Варывода.

«Не буду ўтойваць, у свой час у многіх спецыялістаў дамінаваў пункт гледжання, што наяўнасць уласнага вытворцы будзе ўдарам па інтарэсах імпарцёрскай сеткі, ушчамленнем інтарэсаў аўтадылераў. На мой погляд, гэтага не адбылося. Нас сёння больш аб'ядноўвае, чым падзяляе. «БелДжы» з'яўляецца паўнавартасным членам аўтамабільнай асацыяцыі. Мы стаім плячом да пляча, супрацьстаім выклікам часам нядобрасумленнай канкурэнцыі. У нас агульныя падыходы па большасці пытанняў. Мяркую, прыход на рынак «БелДжы» прывёў да таго, што змяняецца ментальнасць беларускага спажыўца», — адзначыў старшыня БАА.

Закранаючы пытанне перспектыў развіцця аўтарынка, прадстаўнік асацыяцыі адзначыў, што беларусы сталі больш лаяльна ставіцца да аўтамабіляў кітайскай вытворчасці. Колькасць машын з гэтай краіны на беларускім рынку пастаянна павялічваецца, пашыраецца мадэльны рад. Доля кітайскіх машын на беларускім рынку ў кастрычніку гэтага года перавысіла 60 %, заўважыў Сяргей Варывода. Ён таксама адзначыў, што беларускія дылеры ўжо прайшлі «дно продажаў» і цяпер паступова выраўноўваюць паказчыкі. «Паўнавартаснае аднаўленне беларускага аўтарынку пачнецца прыкладна з сярэдзіны вясны наступнага года».

## ГАРАДСКІ СЕДАН GEELY EMGRAND 7 NEW — У ЛІНЕЙКУ НАСТУПНАГА ГОДА

«Мы звярнулі ўвагу на тое, што ў класе красовераў нам удалося заняць годнае месца на айчынным рынку. Але ёсць седаны, якія мы пакуль не прапаноўвалі рынку. Таму ўвазе прапанаваны абноўлены седан — Geely Emgrand 7 NEW. Гэта аўтамабіль 4-га пакалення, які, на мой погляд, вельмі выгадна адрозніваецца ад папярэдніх мадэляў і павінен спадабацца нашым спажыўцам. Мы вядзём работу над гэтым аўтамабілем, хочам, каб ён увайшоў у лінейку наступнага года», — сказаў генеральны дырэктар кампаніі.

Гэты гарадскі седан вызначаецца кузавам у стылі флагманскага Geely Preface. Аўтамабіль абсталяваны атмасферным бензінавым рухавіком унутранага згарання JC — 4g15b аб'ёмам 1,5 л і пяціступеньчатай механічнай каробкай перадач або варыятарам.

Гендырэктар прадпрыемства адзначыў, што цяпер праводзяцца тэхнічныя работы і праверкі. А цана на новую мадэль пакуль не ўстаноўлена. «Але яна будзе канкурэнтнай у сегменце седанаў. Мы ўбачылі, што гэты сегмент развіваецца, да самы масавы і патрабуе абнаўлення», — падкрэсліў ён.

«Што датычыцца красовераў, плануецца, што ў наступным годзе мы працягнем вырабляць і рэалізоўваць Geely Coolray і Geely Atlas Pro. Мы бачым, што яны вельмі добра ўспрымаюцца і айчынным, і расійскім рынкамі. І ёсць новы красовер Geely Monjaro, які ўжо прайшоў сертыфікацыю ў Расіі. Таксама прапрацоўваем пытанне, каб ён увайшоў у лінейку, даступную для нашых спажыўцоў», — дадаў Генадзь Свідзерскі.

## УЛАСНЫ ЭЛЕКТРАКАР: ПАКУЛЬ РАСПРАЦОЎКА ВУЗЛОЎ

Гаворачы аб сусветнай тэндэнцыі, Генадзь Свідзерскі звярнуў увагу, што дынамічней за ўсё цяпер развіваецца электратранспарт.

«Паводле звестак, за тры кварталы года ў свеце выраблена 4,72 мільёна электрамабіляў. Да канца года, чакаецца, іх вытворчасць дасягне 6,5 мільёна аўто. Акрамя таго, апошнія два месяцы ў аб'ёме продажу легкавых аўтамабіляў 10 % устойліва займаюць менавіта электракары. Так, у Беларусі ёсць усе шанцы далучыцца да гэтай дынамікі пры лінейнай вытворчасці і эксплуатацыі электрамабіляў. Працягласць нашых дарог адносна невялікая, а якасць добрая. Да таго ж, на гэты момант у нас створана добрая інфраструктура для зарадных станцый», — адзначыў спецыяліст.

Паводле яго слоў, Беларусь мае ўсе магчымасці стаць пілотным праектам і забяспечваць вялікую дынаміку прымянення электрамабіляў як у эксплуатацыі, так і ў вытворчасці. Аднак, кажучы аб вытворчых магчымасцях, дадаў, што тут ёсць некаторыя стрымліваючыя фактары. «За пяць гадоў нам прыйшлося цалкам абнавіць мадэльны рад, а новыя мадэлі для любога завода — гэта выдаткі, якія неабходна акупляць. Таму мы не можам так хутка прасоўвацца наперад».

А пакуль... «БелДжы» летась выпусціў на беларускі рынак электрамабіль Geely Geometry C. Да канца года плануецца паставіць дадатковую колькасць гэтых машын дылерскім цэнтрам. «Па далейшым развіцці электрамабіляў мы вядзём перамовы, у тым ліку і з расійскімі калегамі. Я двойчы выязджаў на завод «АўтаВАЗ», там таксама вядуцца работы па электрамабілях. Была ідэя зрабіць электрамабіль, больш выкарыстоўваючы айчынныя напрацоўкі. Яны ёсць у Акадэміі навук. Хацелася б, каб гэтая кампетэнцыя больш развівалася ў нас у краіне і ў рамках Саюзнай дзяржавы», — сказаў Генадзь Свідзерскі.

«Пакуль ёсць дамоўленасці аб распрацоўцы шэрагу вузлоў і іх выкарыстанні нашымі расійскімі калегамі. Глабальных дамоўленасцяў аб саюзным электрамабілі пакуль няма. Але па павышэнні кампетэнцый у гэтай галіне мы таксама будзем прыкладаць намаганні ў наступным годзе. Такая задача стаіць, і мы над ёй будзем працаваць», — падкрэсліў гендырэктар прадпрыемства.

## У 2023 ГОДЗЕ — 35 ТЫСЯЧ МАШЫН

«У прадпрыемства «БелДжы» сёлета былі пэўныя складанасці. Аднак усе пытанні вырашаны. У кастрычніку завод вырабіў 3,1 тысячы легкавых аўтамабіляў, задача на лістапад — выпусціць крыху больш за чатыры тысячы машын. А ў снежні ў планах вырабіць пяць тысяч аўто. Такім чынам, сумарна па годзе атрымаецца крыху больш за 25 тысяч. Па колькасці гэта крыху менш, чым летась, калі было выпушчана 29,4 тысячы аўтамабіляў. З улікам таго, што структура змянілася, і мы пачалі вырабляць больш складаныя і дарагія па кошце аўто, то сума ў грашовым выражэнні будзе на ўзроўні 2021 года — больш за 500 мільёнаў долараў», — сказаў **намеснік прэм'ер-міністра Пётр ПАРХОМЧЫК** у інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1».

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў планах на наступны год вырабіць як мінімум 35 тысяч аўтамабіляў. Хоць перад заводам стаяла прамая задача, пастаўленая Прэзідэнтам, выйсці на праектную магутнасць 60 тысяч машын за год. «Цяпер важна разабрацца, ці зможам мы такую колькасць аўтамабіляў прадаць на беларускім рынку і на рынку Расійскай Федэрацыі. Калі гэтыя лічбы будуць пацвярджацца, гэта значыць рынак будзе гатовы спажыць такую колькасць аўтамабіляў, то, адпаведна, мы будзем выбудоўваць сваю працу і планы, каб выканаць пастаўленую задачу», — падкрэсліў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**У тэму**

## Электракары змогуць зараджацца за дзевяць хвілін

**Гэта досыць прыемная навіна для «зялёных» кіроўцаў. У канцы года ў Мінску плануюць адкрыць першы ў СНД асобна размешчаны суперхуткі зарадны комплекс для электракараў.**

Паводле паведамлення прэс-службы «Беларуснафты», гэты комплекс агульнай магутнасцю 700 кВт з'явіцца ў мікрараёне Брылевічы, на разваротным кальцы. Сярод асноўных пераваг комплексу называюцца магчымасць зарадкі электробусаў адначасова з электрамабілямі на высокай магутнасці, наяўнасць сістэмы назапашвання энергіі, крамы безаператарнага гандлю і ўкараненне сістэм «разумнага горада».

Характэрна, што падобная ўстаноўка дазваляе адначасова разам з электробусам зарадзіць восем легкавых «электрычак». Магутнасць зараду будзе дзяліцца дынамічна з прыярытэтам для першага.

Як паведамілі прадстаўнікі электрасеткі, папоўніць узровень зараду, якога хопіць на 300 кіламетраў прабегу, на самай магутнай калонцы можна будзе прыкладна за дзевяць хвілін. Што датычыцца коштаў, то стануць прымяняцца стандартныя тарыфы (сёння цана хуткай зарадкі на станцыях Malanka складае 0,49 рубля/кВт·г).

Акрамя таго, на этапе праектавання цяпер знаходзіцца яшчэ восем вельмі хуткіх зарадных комплексаў. Яны будуць уведзены ў эксплуатацыю ў 2023 годзе: тры з'явяцца ў сталіцы, два ў Гродне і тры — на трасе М1. Адзначаецца, што гэта першая частка ўводу такіх комплексаў, якія можна назваць паўнавартаснымі запраўляльнымі станцыямі, дзе электракар будзе зараджацца столькі ж часу, колькі сёння звычайны аўтамабіль запраўляецца на традыцыйнай АЗС.

Таксама кампанія абяцае, што да канца года ўвядуць у строй яшчэ каля 30 ЭЗС, а ў 2023-м плануецца адкрыццё 60 адзінак станцый хуткай зарадкі Mode 4 магутнасцю 50 кВт.

Цяпер зарадная сетка Malanka ўключае больш за 600 зарадных станцый у абласных і буйных раённых гарадах і на асноўных аўтамагістралях краіны, што ўжо сёння забяспечвае свабоднае перамяшчэнне па ўсёй тэрыторыі краіны. Пры гэтым на трасах устаноўлены, у тым ліку, зарадныя станцыі магутнасцю 180 кВт.

Як адзначалася на вебінары «Вопыт эксплуатацыі электратранспарту юрыдычнымі асобамі: заканадаўства, ільготы, выгады», сёння будуць уведзены аналагі паліўных карт, якія стануць рэалізоўвацца праз модуль для юрыдычных асоб у праграмным забеспячэнні. Сістэма скідак таксама прадугледжаная. Так, пры аб'ёме паслуг, аплачаных карыстальнікам у папярэднім месяцы (тысяч кВт·г), зніжка складзе ад 2 % да 14,5 %.

Акрамя таго, «Беларуснафта» на дагаворных умовах можа аказваць розныя паслугі: ад інтэграцыі зарадных станцый, якія ўстанаўліваюцца іншымі арганізацыямі, у сваім праграмным забеспячэнні Malanka і кансультацый па выбары месцаў, тыпаў зарадных станцый і аптымальнага механізму ўстаноўкі зарадных станцый да распрацоўкі ўнікальнага праекта пад ключ па стварэнні ўласнай зараднай сеткі.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# СПОСАБ РАЗВЕЯЦЦА, ЗВЫЧКА ЦІ ЗАЛЕЖНАСЦЬ?

## Анколагі і наркалагі далі парады па барацьбе з тытунёвай залежнасцю

**ПАВОДЛЕ звестак аўстралійскіх медыкаў, курцы паміраюць на дзесяць гадоў раней, чым людзі, незалежныя ад шкоднай звычкі. Працяглае курэнне звязана з 17-разовым павелічэннем рызыкі развіцця хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх. Курэнне ў восем разоў павышае рызыку з'яўлення атэрасклерозу, таксама ўзрастае верагоднасць узнікнення раку лёгкіх. А паводле даных навукоўцаў з універсітэцкага каледжа Лондана, сярод асноўных прычын узнікнення дэменцыі ёсць і курэнне.**

**Тым часам беларускія анколагі пачалі праводзіць скрынінгавае абследаванне на рак лёгкага сярод курцоў. Яго прайшлі ўжо 1,5 тысячы беларускіх мужчын, якія не мелі скаргаў на стан здароўя, і рак лёгкага выяўлены ў 1% з іх. Якія яшчэ віды злаякасных пухлін выклікае курэнне? Ці ёсць шкода ад электронных цыгарэт і ці дапамагаюць яны кінуць курыць? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты.**

### Падчас скрынінгу ў 75 % пацыентаў рак выяўляецца на 1-й-2-й стадыі

Як адзначае **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі таракальнай паталогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Аляксей КУРЧАНКОЎ**, уздзеянне курэння на арганізм сістэмнае: паражаюцца не толькі лёгкія і слізістыя, а ўсе органы і сістэмы. Яно выклікае не толькі фізічную, але і псіхічную залежнасць, адбіваецца на сэрцы і сасудах, прыводзіць да мультыфакальнага атэрасклерозу, сур'ёзнага пашкоджання слізістых поласці рота. З-за курэння развіваюцца розныя віды пухлін, пачынаючы ад раку губы, слізістых поласці рота, гартані да раку лёгкага (курэнне — адна з асноўных прычын яго развіцця), раку нырак і мачавога пузыра.

— Нярэдка да нас паступаюць пацыенты з дыягназам «рак лёгкага», якія маюць і спадарожныя захворванні: хранічную абструктыўную хваробу лёгкіх, сістэмны атэрасклероз, кардыясклероз. Такі пацыент мае патрэбу ў дапамозе не толькі анколага, але і сасудзістага хірурга, кардыяхірурга. У гэтых выпадках праводзяць сімультантныя аперацыі — не толькі на лёгкіх, але і на сасудах сэрца, — расказвае Аляксей Курчанкоў.

Сёння ў Беларусі праводзіцца скрынінгавая праграма па дыягностыцы раку лёгкага. У яе ўключаны мужчыны ва ўзросце ад 50 да 70 гадоў са стажам курэння не менш за 20 гадоў па пачку цыгарэт у дзень. Скрынінг пакуль робіцца ў Мінскім, Салігорскім і Гродзенскім раёнах. Праведзена больш за 1,5 тысячы нізкадозавых камп'ютарных тамаграм у пацыентаў з высокай рызыкай развіцця раку лёгкага.

— Мы маем першыя вынікі скрынінгавай праграмы. Выяўлена 16 пацыентаў з дыягназам «рак лёгкага», гэта 1 % ад абследаваных. Па літаратурных звестках, выяўляльнасць падчас скрынінгавага абследавання складае ад 1 да 4 %.

Гэтыя пацыенты прааперыраваны. У 75 % з іх — 1-я-2-я стадыя, пры тым што ў стандартнай рэнтгенаграфіі выяўляльнасць у 1-й-2-й стадыі ніжэйшая за 40 %. Таму варта працягваць як скрынінгавыя даследаванні, так і і нацыянальную барацьбу з курэннем, — падкрэслівае анколаг.

### Колькасць раку ротавай поласці і гартані расце

**Загадчык кафедры анкалогіі БелМАПА Аляксандр ЖУКАВЕЦ** працягвае, што на 1-й-2-й стадыі захворванне лечыцца паспяхова. На жаль, звычайна выяўляецца яно, як правіла, калі ёсць нейкія скаргі, а гэта ўжо больш позняя стадыі. І тут гаворка ідзе толькі аб падаўжэнні жыцця, а не вылечванні.

— Калі праранжыраваць вядомыя канцэрагенныя фактары, то курэнне займае адно з лідзіруючых месцаў, як і ўжыванне алкаголю, лішняя вага, ультрафіялетавае выпраменьванне. Прычым ва ўсіх краінах тытунь — значны фактар. І калі сёння ў жанчын у свеце па распаўсюджанасці на першым месцы рак малочнай залозы, які амаль не звязаны з курэннем, то ў структуры смяротнасці на першым месцы стаіць рак лёгкага. Гэтак жа, як і ў мужчын, — праводзіць статыстыку Аляксандр Жукавец.

Вядома, што не ва ўсіх, хто курыць, развіваецца рак, але ёсць і рызыка іншых захворванняў з не менш трагічнымі наступствамі. Прычым чым старэйшым становіцца чалавек, тым больш складана яму даецца адмова ад курэння.

— Дарослага цяжка пераканаць, толькі калі ён бачыць, што з'явілася пагроза смерці, то і курыць кідае, і спортам пачынае займацца. Пазбаўляцца шкоднай звычкі лепш як мага раней. Калі казаць пра рызыку развіцця таго ж раку лёгкага, каб яна знізіліся да сярэднепапуляцыйнага ўзроўню ў таго, хто адмовіўся ад цыгарэт, патрэбна да 10—15 гадоў, — адзначае анколаг.

Аляксандр Жукавец звярнуў увагу, што калі па раку лёгкага ў нашай краіне ў апошнія гады назіраецца пэўная стабілізацыя, то па раку слізістай ротавай поласці і гартані маецца рост захворванняў сярод працаздольнага насельніцтва. Кожная 10-я смерць ад злаякаснай пухліны — гэта смерць ад раку ротавай поласці, ратаглоткі і гартані. Прытым, што пухліна адносіцца да візуальнай лакалізацыі — каб яе выявіць, не трэба выконваць камп'ютарную тамаграфію, дастаткова агляду ўрача.

— Уся праблема анкалагічных захворванняў у тым, што іх сімптомы праяўляюцца, калі яны ўжо дастаткова распаўсюджаны. Таму лепш максімальна абараніць сябе, — рэзюмуе Аляксандр Жукавец.



### Кінуць курыць, замяніўшы цыгарэты на вэйп, атрымаецца не ў кожнага

**Загадчыца амбулаторнага наркалагічнага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага цэнтра Вольга КАЛАСОЎСКАЯ** расказала, што шкодную звычку курыць мае прыкладна трэць беларусаў, з іх большая частка — мужчыны. Аднак гэта датычыцца класічных цыгарэт.

— Цяпер краіну захапілі вэйпы, і колькасць людзей, якія кураць, значна павялічваецца. Большая частка школьнікаў атрымлівае гэту дрэнную звычку ў раннім узросце. Калі пра шкоду класічных цыгарэт усе ведаюць, то вэйпы пазіцыянуюцца як абсалютна бясшкодныя, быццам бы яны не выклікаюць залежнасці і дапамагаюць кінуць курыць. Пры гэтым шкода вялікая. У іх выкарыстоўваюць солевы нікацін. А ён хутчэй трапляе ў кроў і выклікае больш хуткае прывыканне. Таксама там выкарыстоўваюцца розныя дымячыя дабаўкі. З-за іх пры параванні шкодныя рэчывы застаюцца суспензіяй і кроплямі асядаюць у лёгкіх, — расказала ўрач.

Яна дадала, што кінуць курыць шляхам замены звычайных цыгарэт на вэйпы атрымліваецца не ў кожнага. Амаль трэць курцоў, якія ўжываюць вэйпы, праз год вяртаецца да выкарыстання класічных цыгарэт. А калі вы пачынаеце карыстацца вэйпамі, то рызыка перайсці на класічныя цыгарэты вышэйшая, чым у таго, хто не курыць.

— Залежнасць — гэта не толькі фізічнае, але і псіхалагічнае паняцце, таму тут патрэбна не замена цыгарэт на вэйпы, а работа з псіхолагам, псіхатэрапеўтам, каб сфарміраваць устаноўку «Жыццё без цыгарэт», — падкрэсліла Вольга Каласоўская.

**Урач па медыцынскай прафілактыцы, загадчык аддзела грамадскага здароўя Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ганна РОДЗІЧ** расказала, што каля 19 % беларусаў у хатніх умовах адчуваюць уздзеянне другаснага тытунёвага дыму (або пераносяць пасіўнае курэнне), у тым ліку дзеці. Яна нагадала, што пералік месцаў, дзе курэнне забаронена, пастаянна пашыраецца. У прыватнасці, яно забаронена ў аўтамабілі, калі там ёсць непаўналетняе дзіця. Прымаюцца меры па абмежаванні курэння на працоўных месцах. Ёсць установы, напрыклад медыцынскія, дзе курэнне цалкам забаронена.

**Кіраўнік гарадскога Цэнтра здароўя Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Сняжана КАЎРЫГА** прывяла вынікі апытання аб прычынах курэння. Фактарамі, якія найбольш спрыяюць распаўсюджванню курэння, 31 % беларусаў лічыць нізкі інтэлектуальны і культурны ўзровень, 20 % — негатыўныя прыклады і ўзоры паводзін у сям'і, а таксама незанятасць і лішак вольнага часу, 13 % адзначылі няўменне спраўляцца з псіхалагічным напружаннем і меркаванне, што курэнне — адзін са спосабаў развеяцца. Прычыны, па якіх апытаныя хочуць кінуць курыць, — пагаршэнне стану здароўя (у 65 %), усведамленне, што курэнне — шкодная звычка (17 %), уплыў навакольных (4 %).

— У групе мужчын ад 30 да 50 гадоў больш за палову мужчын курыць інтэнсіўна — на дзень больш за 15 цыгарэт, — прыводзіць лічбы **галоўны ўрач Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя — наркалогія» Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ**. — Інтарэс медыкаў у тым, каб гэтыя людзі кінулі курыць, бо ў бліжэйшыя гады яны будуць станавіцца пацыентамі анколагаў і кардыёлагаў, паколькі менавіта інтэнсіўнае курэнне прыводзіць да інфарктаў, інсультаў, абструктыўнай хваробы лёгкіх і іншых. На жаль, гэтыя людзі не могуць кінуць курыць без фармакалагічных, псіхалагічных умяшанняў, карэкцыі паводзін. А многія з тых, хто кінуў, вяртаюцца.

Таму калі не ўдаецца адмовіцца ад курэння самастойна, медыкі заклікаюць звяртацца да спецыялістаў. Псіхатэрапеўты, урачы-псіхіятры-наркалагі дапамагаюць справіцца з гэтай шкоднай звычкай з выкарыстаннем усіх сучасных метадаў.

# Каварны першы снег і галалёд

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Павышэнне колькасці траўмаў звязана як з галалёдам, так і са скарачэннем светлавога дня, з пагаршэннем стану дарожнага пакрыцця. З пачатку гэтага года да траўматолагаў звярнулася больш за 26 тысяч беларусаў, з іх больш за 4 тысячы дзяцей. Каля 2,7 тысячы чалавек прыйшлося шпіталізаваць, у тым ліку амаль 250 дзяцей.

— З наступленнем зімы, з выпадзеннем першага снегу работы ў нас павялічваецца ў 2-3 разы, колькасць паступленняў рэзка ўзрастае, і адбываецца гэта, калі сутачны перапад тэмператур складае да 10 градусаў, асабліва, калі з'яўляецца галалёд, — дзеліцца **урач-траўматолаг-артапед, малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі траўматалогіі дарослага ўзросту РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Андрэй БАКАНОЎСКІ.**

### Што важна ўлічваць, каб не атрымаць пералом?

Знізіць траўматызм дапамагае правільна падабраны абутак. Ён мусіць быць на плоскай падэшве (лепш мяккай — гумавай), ідэальна, калі яна рыфленая. Абцас павінен быць нізкім квадратным.

Зімой лепш крыху памяняць хаду, яна мусіць быць максімальна плаўнай. Ісці варта не прамым шырокім крокам, а быццам бы слізгаць нагамі. Памятайце, што чым меншы крок, тым меншая рызыка атрымаць сур'ёзную траўму. І ўвогуле зімой лепш не спяшацца: не бегчы на святлафор ці за аўтобусам, бо менавіта такія дзеянні часта прыводзяць на бальнічны ложак.

Уважліва варта хадзіць паблізу вышынных будынкаў, бо магчымае падзенне ледзяшоў. Таксама варта правільна падбіраць сумку і рэчы, якія вы несяце. Зімой сумкі лепш не насіць на плячы, бо гэта зрушвае цэнтр раўнавагі.

### Як правільна падаць?

Падаць лепш за ўсё на бок, згрупаваўшыся. Нельга прызямляцца на выцягнутыя прамыя рукі. Ногі лепш крыху сагнуць, мышцы напружыць. Тады пашкоджанні падчас падзення будуць мінімальнымі.

Калі ўпалі, важна адразу не ўскокваць, а вызначыць, што баліць. Калі пашкоджана нага, не варта на яе наступаць, штосьці ўпраўляць ці рухаць. Трэба паклікаць на дапамогу ці самастойна патэлефанаваць у «хуткую». Калі бачыце, што пашкоджанне крытычнае, то адразу выклікайце ўрачоў і пастарайцеся налажыць імабілізацыю з таго, што ёсць пад рукой — палка ці дошка.

Калі вы збіраецеся дабірацца да медустановы самастойна, не трэба ехаць у бліжэйшую бальніцу, бо не ўсе яны маюць траўмапункт. Варта таксама патэлефанаваць па нумары 103, і там сарыентуюць, куды варта звяртацца і дзе з вашай траўмай акажуць максімальна спецыялізаваную медыцынскую дапамогу.

Людзям пажылога ўзросту ў дні галалёду лепш не выходзіць на вуліцу, бо нават мінімальнае падзенне нярэдка становіцца прычынай моцнай траўмы, якая істотна змяняе жыццё. Такога ж правіла варта прытрымлівацца і пасля ўжывання алкаголю. З-за расслаблення стану падзенні нярэдка заканчваюцца сур'ёзнымі траўмамі.

### Небяспечныя «ватрушкі»

Звярнулі ўвагу медыкі і на цюбінгі. У апошнія гады катанне на іх стала надзвычай папулярным. Тым часам яно небяспечнае, траўмы вядуць нават да страты здароўя і інваліднасці. Толькі з пачатку гэтай зімы ў адну медустанову — РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі — звярнулася ўжо 13 дзяцей пасля катання на цюбінгах. Штогод некалькі малых атрымліваюць цяжкія чэрапна-мазгавыя траўмы, і не ўсе з іх цалкам папраўляюцца.

— Цюбінгі нашмат больш небяспечныя за санкі. На санках можна затармазіць, а на цюбінгу хуткасць нашмат вышэйшая, і кіраваць ім амаль немагчыма. Акрамя таго, катанне часта адбываецца на стыхійных горках. І побач абавязкова будзе адзінокае дрэва, сцяна ці аўтамабіль, які праязджае па гэтым праездзе раз на гадзіну, але якраз тады, калі дзіця нясецца з горкі, — папярэджвае **урач-нейрахірург вышэйшай катэгорыі РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Яўген МІРАНЕЦ**. — Таму суправаджайце дзяцей, вывучыце мясцовасць, а лепш самі адзін раз з'ездзіце на цюбінгу.

Простая мова

# ЛЯ ГАСЦІНЦА... З МУЗЫКАЙ НАШЫХ СЛОЎ

**Вось і дачакаліся: зіма, першы снег.**
**У вайберы з самай раніцы ў той дзень кароткая навіна пра надвор'е: «У прынцыпе, не холадна, калі сядзець дома...»**
**А калі да таго ж — у добрай кампаніі, з цікавым фільмам ці кніжкай, з кубкам гарачай гарбаты...**
**Пры чарговым пакецiку — маленькая паперка з цытатай Дызраэлі: шлюб — калі ён заснаваны на поўнай гармоніі — найвялікшае шчасце.**
**Прапісная ісціна, а нагадаць не грэх.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## БЕЗ СЯКЕРЫ

Старыя людзі — старыя кнігі. Сярод іх — «Мудрое слово», зборнік рускіх прыказак і прымавак (год выдання 1957-ы).

Адтуль (усміхніцеся!): *«У большевиков ума палата, вот и жить стали богато», «Ленина завет на тысячу лет», «Нет ни рабства, ни оков в стране большевиков»...*

Цікава, той, хто гэта зрыфмаваў ці недзе пачуў і запісаў, сапраўды так думаў? Ці ішоў на кампраміс, каб дагадзіць начальству, каб выдаць кнігу?

...Яны ў тыя часы пісаліся ад рукі — звычайным пяром. А значыць, усё, што напісана, здавалася, і сапраўды, не *«вырубишь...»*, ці (згодна з амаль такім жа ж руска-беларускім зборнікам) «не выймеш» сякерай.

Хіба само адваліцца, без сякеры, пад ціхім прымусам часу і праўды.

## ДАПІЦЬ... І ДАПЕЦЬ!

Горад, трамвай, у салоне шумнае папаўненне: на чарговым прыпынку ў вагон падымаецца (залазіць, «запаўзае», бо высока) група малых — чалавек пад дваццаць!

Самыя спрытныя тут жа займаюць вольныя месцы, дужэйшыя спрабуюць некага спіхнуць альбо пасунуць, цікаўныя — ліпнуць насамі да вокнаў, ці не ўсе адначасова нешта гавораць, штурхаюцца, а хтосьці нават спявае, прычым — даўно знаёмае:

*И тогда наверняка*
*Мы... напьемся коньяка...*

— Стас, я каму сказала? — грозна гучыць над галоўкамі. — Ану, замаўчы!

Голас тут жа змаўкае, хоць яно і шкада, бо цікава ж, што там далей, пасля таго, як нап'ёмся?

## ПАСЕЕШ ПРЫВЫЧКУ...

Леначка — і, здаецца, заўжды? — на пад'ём была лёгкай. У кожную вольную часіну (што ўжо казаць пра адгулы, водпускі, святы) яе нібы ветрам несла — то ў кіно, то з бацькамі на дачу, то на нейкую экскурсію, у госці да сябры, сяброў, сваякоў — і блізкія па месцы жыхарства, і досыць далёкіх...

У Мінск яна прыязджала адна, потым з мужам на пару, а калі ўжо з дзецьмі, — мы ехалі сустракаць.

Што здзіўляла тады, хлопчыкі, нават малыя, выходзілі з вагона з пакункамі ў руках. На спінках таксама было па заплечніку. «Нагружаеце... Не замнога?» — цікавіліся пыталі ў бацькоў. — «Не, — за дваіх адказала Лена. — Яны ж хацелі, прасіліся ў госці, збіралі падарункі... Дык няхай вязуць, няхай прывыкаюць хоць за нешта несці адказнасць».

...Цяпер тыя хлопчыкі амаль дарослыя і вельмі добрыя: найперш — адказныя за свае павадзіны, за настрой бацькоў.

## З ДЫМАМ...

Горад, гмах: каб падняцца на свой паверх, выклікаем ліфт, заходзім...

Туды ж — услед і ў апошні момант — улятае змерзлая маладзічка.

— Нябось, курылі?.. На вуліцы! — па-старэчы заўважаем мы.

— Угу, — ківае ў адказ жанчынка.

— І яно вам трэба?

— Не! — круціць галавой і нават кажа чаму. — Як гляну ў кашалёк, як прыкіну, колькі грошай з дымам сыходзіць...

І гэта ж не найбольшыя страты.

Найбольшыя — не ў кашальку: у знешнасці, голасе, здароўі (свaім і дзяцей) — «павылазяць» (да бабкі не хадзі!), відавочнымі стануць пазней.

І дай бог, не позна!

## ХАЧУ, КАБ УСЕ...

Як ёсць — так ёсць, і, мусіць, ва ўсіх: вясною хочацца зялёнай цыбулі, радыскі, агуркоў, увосень — гарбузовай кашы, вінегрэту, квашанай капусты, селядца пад футрам...

У суседкі ён адмысловы: упрыгожаны рыбіным хвастом, галавой і паўколцамі цыбулі, зверху пасыпаны дробнымі грэцкімі арэхамі. «Мы, — расказвае жанчына, — з унукам іх сёння калолі (ён быў з малатком)... Разам прызналі, што ядры — якраз, як мозг чалавека. Некалькі штучак я малому дала, каб паразумнеў. Дык ён з гэтай жменькай усіх абышоў: маму, бацьку, дзеда. Сказаў, што ім таксама паразумнець не пашкодзіць.

## РЭЧ!

Сямёнаўна — чалавек адказны: сочыць за сваім здароўем, харчаваннем, знешнасцю. Дакладна ведае, што за летнія месяцы (пакуль дача, грады, ягады-грыбы, каларадскі жук, нарыхтоўкі ды іншае) кілаграмаў пяць-сем скідае, а за зімовы — калі горад, калі збольшага кнігі, тэлевізар і пруткі для вязання — амаль столькі ж вяртае: прывычка ў яе амаль штодня важыцца.

Але ж была, бо вага днямі зламалася.

Добра, што дачка з сям'ёю прыехала: зяць нешта там падкруціў, патрос — зварухнулася стрэлка! І потым паказала вагу: праўда, у яго на шэсць кілаграмаў меншую.

«Рамонтнік» здзівіўся, праверыў работу на дзецях — вынік паўтарыўся. «Дык гэта... Файная рэч атрымалася! — прызнаў падлетак-сын. — Па сённяшнім часе, калі ўсе худзеюць, можна з выгадай прадаць!»

...Жанчыны не пагадзіліся, сказалі, што такая — і самім патрэбная.

## ЯНЫ І МЫ

Паводле тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, гасцінец — падарунак ці пачастунак дзецям. Другі сэнс — вялікая праезная дарога, звычайна абсаджаная дрэвамі.

...Толькі сёлета (лепей позна, чым ніколі!) заўважылі нарэшце, як многа сярод іх... яблынь. Прычым зусім не дзічак!..

Гэта значыць, што нехта з папярэднікаў іх насадзіў ці прышчапіў, пакінуў памяць.

Мы, наступнікі, на ўзбочынах гасцінцаў шчодра пакідаем хіба што смецце.

## КАБ ЗРАЗУМЕЦЬ. ХОЦЬ НАРЭШЦЕ...

Анекдот, а можа, і праўда? Дзве жанчыны ў турму трапілі, у агульнай камеры ложак ля ложка пяць гадоў правялі, а выйшлі на свабоду і паўдня яшчэ ля варот пастаялі — не ўсё сказалі адна адной.

Вось і мы... Гаварылі не раз і як быццам пра ўсё, а назаўтра — ліст. Цытата: «Я не сказаў вам аб самым балючым. Калі наша хата згарэла, мы з мамай і сястрычкай (бацька загінуў у фінскую) нейкі час жылі ў суседняй вёсцы, у дзядзькі Ігната. Ён мужчына быў хоць куды! Прыгожы, майстравы, да таго ж, іграў на гармоніку... Жыў каля самага возера, меў сад, агарод, прафесійна, можна сказаць, рыбачыў: нейкім чынам уладкаваўся ў рыбалоўную арцель, ад якой яму далі каня...

У ліхія пасляваенныя часы, калі ў плуг запрагаліся ўдовы, нават самы задрыпаны, лядашчы мужчына быў нарасхват. А ўжо з канём і вось гэты...

Хутка ў мяне з'явілася маленькая сястрычка.

Маці, відаць, спала і бачыла, што Ігнат будзе жыць толькі з ёй. Але ж той не згаджаўся: казаў, што ў цябе, маўляў, сын падрастае: я азірнуцца не паспею, — у сілы ўбярэцца і выганіць...

Ён казаў, а я ўвесь час адчуваў, што лішні, што замінаю маме...

З малых гадоў я стараўся, можна сказаць, выжыльваўся — працаваў і дома, і ў калгасе, браўся за любую работу, і ўсё роўна...

Тату свайго я зусім не помніў. Ад яго засталася хіба што маленькая картачка. Я глядзеў на яе і заліваўся слязьмі: так шкадаваў, што яго забілі!

А цёткі — татавы сёстры — шкадавалі мяне. Я тыднямі мог жыць у іх і не жыць дома...

Каб зразумець маму і хоць нарэшце ды падзякаваць ёй, што нарадзіла, што гадавала, што ў мяне ёсць любімыя сёстры, спатрэбілася амаль цэлае жыццё».

## ПЕРШЫ І АПОШНІ

Бабця Анюта (светлая памяць!) усе свае хваробы лячыла... працай: то-бок магла не магла, уставала, а больш не было каму, ішла даіць, выпускаць у поле кароўку, паліць у печы, варыць есці — на ўвесь дзень (бо потым на работу) і ўсім: дзецям, скаціне, сабе, таму — казала, — хто прыйдзе. Правіла жыцця было: чалавек на парог — трэба пакарміць. Ці хоць прапанаваць.

...Расказвала, як у самым пачатку вайны (муж на фронце) у хату маладзенькі немец зайшоў, бабця падумала: чалавек, нейчы ж сын... І таму — падсунула табурэтку (садзіся, маўляў), хуценька адрэзала лусту хлеба, некалькі скрылікаў сала і нават гасцявой паляндвіцы, наліла ў два кубкі малака — свежага і кіслага, дастала з печы гаршчэчак з тушанай бульбай.

Да першага, другога і трэцяга немец спачатку прынюхваўся, з асцярогай каштаваў, потым, нешта гяргечучы, з апетытам еў, а нарэшце сыта ўсміхнуўся: сказаў ёй «гут» і «данке».

...Болей «нармальных немцаў» бабця, казала, не бачыла: той, маладзенькі, у першыя дні вайны, быў першым і апошнім.

## «ТОЛЬКІ МЕСЯЦАЎ НАЗВЫ ПАКІНЬЦЕ...»

З кнігарні (нават пры сённяшніх цэнах) грэх сысці без пакупак! У ёй не раздражняе нават чарга ля касы: можна ж і пастаяць?

...Жанчына, што ў нас наперадзе, трымае календары — досыць прыгожыя, беларускамоўныя.

— Дочкі папрасілі купіць, — згледзеўшы нашу цікавасць, тлумачыць жанчына. — Яны за мяжой цяпер, абедзве замужам...

А гэта значыць, што недзе там, у іх дамах ці кватэрах, апынуцца (хоць так!) нашы, спрадвечныя

*...Студзень —*
*з казкамі снежных аблокаў,*
*Люты — шчодры на сіні мароз,*
*Сакавік —*
*з сакатаннем і сокам*
*Непаўторных*
*вясновых бяроз...*

Назвы месяцаў паводле Панчанкі. Хоць яны.

Дарэчы, апошнія радкі ў гэтым, вядомым са школы вершы *(«...Ці плачу я, ці пяю, / Ці размаўляю з матуляю — / Мову сваю, песню сваю / Я да грудзей прытульваю»)*, заўсёды здаваліся нейкімі выпадковымі, быццам чужымі...

Аказалася — так яно і ёсць. У паэта спачатку было і, дзякаваць богу, ёсць (адчуйце розніцу!):

*...Ці плачу я, ці пяю?..*
*Восень. На вуліцы цёмна...*
*Пакіньце мне мову маю,*
*Пакіньце жыццё мне!*

## МУЗЫКА НАШЫХ СЛОЎ

...Кавярня ў гэтым будынку ўжо, здаецца, была, потым закрылася і днямі адкрылася зноў, прычым — з новаю назвай, з цікавай абвесткай: патрабуюцца, маўляў... І зусім не кухары, не барыста і прыбіральшчыцы: «Патрабуюцца наведвальнікі! Можна без вопыту...».

На такое запрашэнне грэх, згадзіцеся, не «клюнуць», не адгукнуцца, не зайсці — не ацаніць тое новае месца. Але ж гэта вось — іншым разам, а пакуль...

Мы сустракаемся на старым: замаўляем з сяброўкай каву, у куце займаем столік, гамонім — пра сваё, жыццёвае, міжволі глядзім на людзей.

Яны мяняюцца (сыходзяць, прыходзяць...) і не мяняюцца: мужчына за суседнім сталом даўнавата сядзіць...

Але ж тым часам і ён пазірае на гадзіннік, устае, скіраваўшы да дзвярэй, запыняецца побач (з чаго б?), просіць прабачэння (за што?!), кажа, што хацеў бы падзякаваць...

Ну гэта ўжо зусім незразумела!

Даслоўна:

— *Я ненароком слушал ваш разговор. Понимал, конечно, не всё, но музыка вашей речи... Это нечто! Спасибо!*

З гэтым чалавек сышоў. Мы з сяброўкай (рэдка бачымся і час заставаўся) пасядзелі яшчэ, пагаварылі.

Можа, і для таго (дурань думкай багацее), каб нехта згадаў прыгожае:

*Беларусь, ты не забыта.*
*У душы, як Божы знак:*
*Хата... Канюшына... Жыта...*
*Бульба... Бусел... Шпак...*
*Мроя... Хлопец закаханы...*
*Цемра... Шлях дамоў...*
*Беларусь, ты збудавана*
*З беларускіх слоў.*

З музыкі нашай мовы?

**Валянціна ДОЎНАР.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

23 лістапада 2022 г. № 45 (681)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



# КАПІТАЛЬНЫЯ РАМОНТЫ, ПЫТАННІ ЖКГ І ПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ-ІНВАЛІДАМІ

## З якімі пытаннямі звярталіся людзі да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай падчас асабістага прыёму

**У Савеце Рэспублікі 17 лістапада Наталля Качанава правяла асабісты прыём грамадзян. Людзі звярталіся з праблемамі, звязанымі з нядобраякаснымі рамонтамі, пытаннямі выдзялення арэнднага і сацыяльнага жылля, налічэння пенсіі згодна са стажам, а таксама з дапамогай у працаўладкаванні і добраўпарадкаванні дзіцячых пляцовак.**



Фота БелТА.





Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што праблемы ЖКГ павінны вырашацца адразу на месцах:

— Я папярэджваю: калі праблемы, з якімі звярнуліся людзі, не будуць вырашаны, службовыя асобы, якія за гэта адказваюць, будуць прыцягнуты да адказнасці. Такія пытанні павінны вырашацца на месцах, — падкрэсліла Наталля Качанава.

На асабісты прыём таксама былі запрошаны прадстаўнікі гарвыканкамаў, кіраўнікі адміністрацый раёнаў і супрацоўнікі ЖКГ, каб пастаўленыя грамадзянамі пытанні вырашыліся ў найхутчэйшыя тэрміны.

Падчас прыёму *мінчанка Алена Сяргееўна* расказала, што капітальны рамонт яе дома не быў выкананы ў поўным аб'ёме — будынак здалі з парушэннямі. «У сувязі з тым, што капітальны рамонт увесь час адкладваўся, бягучага рамонту з дня засялення ніхто не рабіў», — паскардзілася жанчына. Звяртаючыся да намесніка кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна сталіцы, які прысутнічаў на прыёме, Наталля Качанава спыталася, што было зроблена для вырашэння праблемы і чаму рамонтныя работы выконваліся па няякаснай дакументацыі. І папярэдзіла:

— Калі аб'ектыўныя заўвагі жыхароў дома не будуць вырашаны, я буду ўносіць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе і кіраўніка адміністрацыі раёна, і вас. Навошта вы прымушаеце людзей судзіцца з вамі, чаму нельга вырашыць пытанне адразу? Дрэнны праект — не трэба яго рэалізоўваць, дрэнная падрадная арганізацыя — адхіляйце, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

*Мінчанка Ганна Аляксееўна* сутыкнулася з наступнай праблемай: яе кватэру ўжо некалькі разоў залівала гарачай вадой, якая цякла з тэхнічнага паверха. У выніку была пашкоджана мэбля, падлога, шпалеры, столь. Старшыня Савета Рэспублікі, звяртаючыся да намесніка кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна, падкрэсліла, што пытанне павінна быць вырашана за тыдзень.

*Яўген Якаўлевіч* звярнуўся з просьбай дапамагчы ў падтрымцы фізічнага стану свайго ўнука, які мае дыягназ, звязаны з расстройствам аўтыстычнага спектру. Але да гэтага часу сям'я не можа знайсці спецыялістаў, якія дапамаглі б вырашыць праблему.

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Эканамічныя абмежаванні — нагода развіваць схаваныя рэзервы

### Расказваем асноўныя навіны мінулага тыдня Савета Рэспублікі

● Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і грамадскім развіцці Віктар Ліскові і старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў прынялі ўдзел у пасяджэнні Савета па ўстойлівым развіцці. На пасяджэнні былі заслуханы справаздачы аб выкананні плана работы Савета па ўстойлівым развіцці на 2021-2022 гады, планы работы на 2023 год і вынікі дзейнасці па рэалізацыі Павесткі-2030. Беларускі бок адзначыў, што негатыўны глабальны кантэкст закранае ўсе краіны свету, у тым ліку і нашу. Асабліва гэта адчуваецца ў сувязі з эканамічнымі абмежаваннямі, якія заходнія краіны ўвялі супраць Беларусі. Але гэтыя акалічнасці садзейнічаюць развіццю скрытых унутраных рэзерваў.

● Пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Тацціяны Рунец быў разгледжаны праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці». Дакумент выкладае ў новай рэдакцыі дзеючы з 2012 года Закон Рэспублікі Беларусь «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)». Унесеная ў Савет Рэспублікі рэдакцыя змяшчае нормы, накіраваныя на ўдасканаленне прававога рэгулявання адносін у сферы неплацежаздольнасці і банкруцтва, зыходзячы з правапрымяняльнай практыкі. На думку членаў Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, прыняцце праекта закона пашырыць магчымасці для абароны правоў прадпрыемстваў, якія апынуліся ў складанай фінансавай сітуацыі, зніме залішнюю нагрузку з судоў, пераклаўшы каардынуючую функцыю працэсу на ўрад і мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама скароціць сярэдні тэрмін працэдур у вядзенні па справах аб неплацежаздольнасці або банкруцтве.

● Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Ліскові прыняў удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным 15-годдзю з дня ўтварэння РГА «Белая Русь», якое прайшло ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Падчас урачыстай цырымоніі Віктар Ліскові зачытаў прывітальны адрас ад імя Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай і ўручыў яго старшыні РГА «Белая Русь», члену Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Алегу Раманаву. У віншаванні, у прыватнасці, адзначаецца: «Белая Русь» аб'ядноўвае шчырых патрыётаў з усіх рэгіёнаў нашай краіны, для якіх імкненне прыносіць карысць грамадству і дзяржаве — вышэйшая мэта і пакліканне жыцця. За гэтыя гады створаная па народнай ініцыятыве арганізацыя стала па-сапраўднаму масавым рухам, адным са слупоў сапраўднай грамадзянскай супольнасці, ядром здаровых і канструктыўных сіл нашай Радзімы.

● Прадстаўнікі Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь прынялі ўдзел у беларуска-расійскім форуме «Моладзь і выбары». Арганізатары форуму — Цэнтральная выбарчая камісія Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Беларусі. Удзельнікі разгледзелі праекты па прававой асвеце, формы і метады навучання моладзі прававой культуры, у тым ліку мадэляванне ўдзелу ў выбарчым працэсе. У другі дзень форуму на пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася сустрэча старшыняў цэнтральных выбарчых камісій Беларусі і Расіі Ігара Карпенкі і Элы Памфілавай з удзельнікамі форуму, у ходзе якой была арганізавана дыскусія ў фармаце адкрытага мікрафона.

## КАПІТАЛЬНЫЯ РАМОНТЫ, ПЫТАННІ ЖКГ І ПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ-ІНВАЛІДАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Я падключу ўсіх каго трэба, — адрэагавала Наталля Качанава. — Сыходзячы з падобных зваротаў, быў створаны Кансультатыўны савет, у які ўваходзяць міністр адукацыі, міністр аховы здароўя, супрацоўнікі РНПЦ і медыкі. Якраз на мінулым тыдні мы правялі пасяджэнне савета менавіта па гэтай праблеме. Мы адправім вашага хлопчыка да лепшага спецыяліста.

*Ірына Іосіфаўна* папрасіла разабрацца з сітуацыяй зносу яе дома. Тэрыторыя, на якой знаходзіцца будынак, падлягае забудове. Але ўжо цягам года службы адкладваюць знос, а канкрэтных тэрмінаў не называюць. Намеснік кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна адзначыў, што пакуль не могуць знайсці забудоўшчыка.

— Навошта ўводзіць людзей у зман? Трэба было адразу адпрацаваць, ці будзе ў вас УКБ, — звярнулася да намесніка адміністрацыі раёна Наталля Качанава. — Пачынайце паэтапны знос згодна з генпланам, асвойвайце пляцоўкі і давайце людзям жыллё. Калі не можа прыняць якое-небудзь рашэнне адміністрацыя раёна — ёсць дэпутаты. І недапушчальна, калі ЖКГ ці адміністрацыі раёнаў накіроўваюць людзей у суды замест таго, каб вырашаць праблемы, — падсумавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Усе агучаныя падчас асабістага прыёму пытанні былі ўзяты на кантроль.

**Арына КАРПОВІЧ.**

ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

# «ТРЭБА, КАБ ВАШУ РАБОТУ БЫЛО ВІДАЦЬ»

## Як прайшла сустрэча Наталлі Качанавай з Маладзёжным саветам

**Падчас сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з прэзідыумам Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе была абмеркавана дзейнасць савета, а таксама вызначаныя шляхі далейшай работы са школьнікамі і студэнтамі. Сярод асноўных тэм — функцыянаванне савета, работа з моладдзю ў рэгіёнах і папулярызацыя здаровага ладу жыцця. Звяртаючыся да ўдзельнікаў, Наталля Качанава адзначыла, што сустрэча накіравана на абмеркаванне задач, аб якіх члены дамовіліся на першым пасяджэнні Маладзёжнага савета другога склікання:**



Фота БелТА.

— Вы шмат удзельнічаеце ў розных мерапрыемствах, якія праводзіць Савет Рэспублікі, у тым ліку ў выязных прэзідыумах і прыёмах па асабістых пытаннях грамадзян. Я бачу, што вы актыўна ўключыліся ў работу. Гэта вельмі важна. Я бы хацела пачуць ад вас прапановы, у тым ліку ідэі па нашай асноўнай рабоце над законапраектамі.

Папярэдняе скліканне Маладзёжнага савета налічвала 70 членаў. У склад новага саставу ўвайшлі 138 чалавек з розных рэгіёнаў краіны.

— Трэба, каб вашу работу было відаць, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Вы павінны даносіць інфармацыю да моладзі з вашых гарадоў і раёнаў, ваша дзейнасць павінна даваць вынікі. Сярод вас ёсць тыя, хто працуе ў сферах адукацыі, аховы здароўя, спорту і турызму, таму гэтыя пытанні вы павінны адсочваць і адпрацоўваць.

У сваю чаргу члены Маладзёжнага савета расказалі аб выніках сваёй дзейнасці. Сярод праектаў — лідарская платформа «Каманда будучыні», інтэлектуальны квіз, Беларуская маладзёжная парламенцкая ліга дэбатаў. Аб гэтым расказаў **старшыня Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Беларусі Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ**:

— Мы стартанулі паспяхова: скліканне павялічылася ў два разы, гэта значыць, што нашы магчымасці павялічыліся. Асноўная мэта ў тым, каб нашы дэлегаты, якія прадстаўлены ў кожным раёне і вобласці краіны, працавалі з таленавітай моладдзю на месцах, стварылі ўмовы для развіцця маладзёжнага парламентарызму. Сярод нашых традыцыйных мерапрыемстваў можна адзначыць лідарскую платформу «Каманда будучыні», Science Quiz — інтэлектуальны квіз рэспубліканскага ўзроўню сярод медыцынскіх універсітэтаў. Таксама намі быў прэзентаваны праект пад назвай «Адзіны парламенцкі дзень», у рамках якога мы наведваем школы, каледжы, праводзім для навучэнцаў і школьнікаў прэзентацыйныя сустрэчы, дзе расказваем пра Маладзёжны парламент, чым ён жыве, як можна ў яго ўступіць, як можна сачыць за яго дзейнасцю ў сацыяльных сетках і даведвацца аб самых актуальных мерапрыемствах.

У планах Маладзёжнага савета — «Беларуская маладзёжная парламенцкая ліга дэбатаў», падчас якой маладыя людзі змогуць далучыцца да парламенцкай дзейнасці, вядзення дэбатаў, а таксама авалодаць майстэрствам публічнага выступлення.

— Нашы мерапрыемствы накіраваны на фарміраванне лідараў, пошук і стварэнне ўмоў для іх далейшага развіцця, — адзначыў Мікіта Рачылоўскі.

Старшыня Маладзёжнага савета звярнуў увагу на тое, што савет праводзіць актыўную работу ў інтэрнэт-прасторы. Так, у сацыяльных сетках аператыўна з'яўляецца інфармацыя аб дзейнасці членаў Маладзёжнага савета. А аднолькавая версія сайта дазваляе кожнаму наведвальніку не толькі атрымаць хуткі адказ на пытанне, але і звязацца з членам савета.

Аб узаемадзеянні актыўнай моладзі з розных рэгіёнаў расказаў **старшыня камісіі па рэгіянальнай палітыцы і ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Маладзёжнага савета Станіслаў СЯМЁНАЎ**:

— На базе Гомельскага раённага Савета дэпутатаў прайшла маладзёжная міжрэгіянальная сустрэча. Да нас прыехаў Маладзёжны савет Дзяржынскага раёна, а таксама студэнты з Гродна і Мінскай вобласці. Гасцям мы расказалі, чым жыве працоўная моладзь у сельскім раёне. Адзначу, што дзякуючы такім сустрэчам у нас ёсць магчымасць дзяліцца вопытам, вучыцца парламенцкай дзейнасці і даведвацца, што цікавага ёсць у студэнцкім самакіраванні.

Азнаёміўшыся з прэзентацыяй Маладзёжнага савета, Наталля Качанава адзначыла, што ёсць кірункі, якія патрабуюць актыўнай работы. Сярод іх — традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, моцныя рэгіёны і папулярызацыя здаровага ладу жыцця ў моладзі:

— Спектр пытанняў, з якімі трэба працаваць, у вас даволі шырокі. Гэта і маладзёжная палітыка, і адукацыя, і рэалізацыя дзяржаўных праграм. Таму сітуацыю трэба вывучаць, асабліва на месцах. А для вырашэння праблемы шукаць правільнае, рацыянальнае зерне, — рэзюмавала Наталля Качанава.

**Арына КАРПОВІЧ.**

ПА-СУСЕДСКУ

# РЭГІЁНЫ — РУХАВІК ПРАГРЭСУ

## Саюзныя парламентарыі абмеркавалі супрацоўніцтва Магілёўскай і Бранскай абласцей

**Пытанні міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва Бранскай і Магілёўскай абласцей былі разгледжаны на пасяджэнні камісіі Парламенцкага сходу па энергетыцы і транспарце. Сустрэча праходзіла ў рэжыме анлайн і афлайн-канферэнцыі.**



Магілёўская і Бранская вобласці плённа супрацоўнічаюць ужо не першы год. Пагадненне паміж Бранскай абласной Думай і Магілёўскім абласным Саветам дэпутатаў было падпісаныя яшчэ ў лістападзе 2013 года. За перыяд супрацоўніцтва было рэалізавана шмат сумесных праектаў, наладжаны сувязі паміж прадпрыемствамі, установамі адукацыі і творчымі калектывамі. Магілёўскі Беларуска-Расійскі універсітэт плённа супрацоўнічае з Бранскім тэхнічным універсітэтам, а МДУ імя А. Куляшова — з Бранскім універсітэтам імя І. Пятроўскага. Толькі сёлета было рэалізавана шэсць сумесных міжвузаўскіх мерапрыемстваў. Паміж рэгіёнамі існуюць моцныя культурныя сувязі, плённа вядзецца супрацоўніцтва ў сферы прамысловасці і сельскай галіны, харчовай перапрацоўкі. Але патэнцыял для супрацоўніцтва ёсць. **Дырэктар Дэпартамента эканамічнага развіцця Бранскай вобласці Міхаіл ЯРОХІН** заўважыў, што іх рэгіён зацікаўлены ў пастаўках ліфтавага абсталявання: у рэгіёне плануецца замяніць 370 ліфтаў.

Наогул, паміж Магілёўскай вобласцю і рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі на сёння дзейнічае 176 пагадненняў аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і гуманітарнай сферах. Пра гэта паведаміў **старшыня Савета па міжрэгіянальным і прыгранічным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР**.

— Сёння Магілёўская вобласць падтрымлівае сяброўскія сувязі на аснове заключаных дакументаў аб супрацоўніцтве з 26 расійскімі рэгіёнамі, — падкрэсліў ён.

Пра важнасць міжрэгіянальных сустрэч паведаміла **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК**.

— Час, у які мы жывём, ставіць перад Саюзнай дзяржавай цэлы шэраг сур'ёзных стратэгічных задач, — адзначыла яна. — Згуртаванасць брацкіх народаў і паглыбленне сацыяльна-эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва як падмурка саюзнай інтэграцыі становіцца відавочным прыярытэтам на фоне ўзмацнення недружалюбных дзеянняў з боку асобных краін. У сучасных умовах міжрэгіянальнае супрацоўніцтва нашых краін набывае яшчэ больш важкія ролю і значэнне. Менавіта рэгіёны з'яўляюцца той сілай, якая здольная эфектыўна вырашаць задачы і вывесці нашы краіны на ўпэўнены рух наперад.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

ТРЫ ПЫТАННІ ДА МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

# У РУЖАНАХ МУСЯЦЬ РАСЦІ РУЖЫ

**ГАРАДСКІ пасёлак Ружаны, які да сярэдзіны 50-х гадоў быў раённым цэнтрам, стаіць на скрыжаванні ўсіх дарог. Тут перасякаюцца маршруты, што злучаюць Украіну з Прыбалтыкай, Мінск з Белавежскай пушчай, Гродзеншчыну з Палессем. Паток машын па галоўнай вуліцы можна параўнаць з рухам не самага малога горада. Выглядаюць Ружаны не толькі ажыўлена, але і даволі прывабна. Адсюль і першае пытанне да старшыні Ружанскага сельскага Савета Аксаны ЮРКОЎСКАЙ:**



**— Што стала вызначальным этапам для цяперашняга вонкавага выгляду пасёлка?**

— Вядома, «Дажынкі» 2019 года. Тады гарадскі пасёлак поўнасцю перапрацавалі, пераатварыўся, памаладзеў, папрыгажэў. У добраўпарадкаванне, рамонт было ўкладзена крыху больш за чатыры з палавай мільёны рублёў бюджэтных сродкаў. Удалося многае зрабіць. Памянялі шэраг інжынерных камунікацый, палепшылі дарожнае пакрыццё і вулічнае асвятленне, правялі капітальны рамонт дамоў па вуліцы Савецкай. Іншы выгляд набыў сквер Якуба Коласа ў цэнтры, там акультурана возера, пракладзены дарожкі, устаноўлены лаўкі, з'явіліся дзіцячая і спартыўная пляцоўкі.

На будынках фасадаў дамоў па вуліцы Урбановіча, якая вядзе да Ружанскага палаца, нанеслі рэпрадукцыі карцін, выцінанак, гравюр, што надало асаблівы гістарычны каларыт. На гэтай жа вуліцы знаходзіцца бальніца, якая перажыла рамонт падчас падрыхтоўкі да фестывалю. Дарэчы, заканчвалі работу па бальніцы ўжо пасля свята, увялі ў строй новы харчовы блок.

**— Якая яшчэ работа па добраўпарадкаванні і паляпшэнні праведзена пасля «Дажынак»?**

— Пры падрыхтоўцы любых «Дажынак», калі памятаеце, гаворыцца, што праведзеная ў гэты перыяд работа дае старт, становіцца драйверам развіцця. Задачай мясцовай улады становіцца падтрымліваць зробленае і развіваць далей. Тады адраматавалі цэлы шэраг дамоў. Сочым за імі, праводзім касметычны рамонт, адзін з іх, па Савецкай, 20, падправілі гэтым летам.

Хутка будзе адкрыта новая крама, якую чакаюць у пасёлку. Бярозаўскі мясакансервавы камбінат выкупіў памяшканне былой кулінарыі, правёў капітальны рамонт, зараз вядзецца аснашчэнне і абсталяванне ўнутры. Тут будзе фірменная крама і кафетэрый, што вельмі важна. Кожны дзень праз населены пункт праязджае шмат экскурсантаў, транзітных падарожнікаў — выпіць кавы, хутка перакусіць для многіх выглядае надзвычай актуальна.

Што хачу адзначыць асабліва, адразу пасля «Дажынак» мы ўзялі курс на масавае азеляненне. Ужо ў 2020 годзе ў пасёлку было высаджана 804 адзінкі зялёных насаджэнняў, у іх ліку 500 самшытаў, яны падрастуць і нададуць новы выгляд алеі драўляных скульптур. Пасадзілі яшчэ больш за дзве сотні туй, елкі, барбарысу — усяго на суму звыш 6100 рублёў.

Летась было высаджана 186 дрэў і кустоў, часткова памянялі старыя, любімыя месцічамі плакучыя вербы, якія давялося знесці з-за аварыйнасці, часткова абнавілі пасадкі глогу. А сёлета, у Год гістарычнай памяці, правялі вялікую работу па азеляненні мемарыялаў, брацкіх магіл. Напрыклад, высадзілі туі і ядлоўцы каля брацкай магілы спаленай вёскі Байкі, упрыгожылі мемарыялы і брацкія магілы ў Паўлаве, Бакунах — усяго пяць памятных месцаў. Налета правядзем гэтую работу на іншых аб'ектах.

Ружаны вядомыя сваім прыгожым чырвоным глогам, які некалі развёў заслужаны настаўнік краіны Уладзімір Рэкуць, а налета яшчэ высадзім ружы ў цэнтры пасёлка. У Ружанах проста мусяць быць ружы, якія, паводле адной з версій, і далі назву.

**— Не толькі ў нашай краіне, але і ў многіх краінах свету Ружаны цяпер трывала асацыююць з іх галоўнай славутасцю — палацам. Што новага ў музейным палацавым комплексе?**

— Сёння Ружанскі палацавы комплекс роду Сапегаў — адзін з найважнейшых турыстычных аб'ектаў краіны. Музей наведваюць арганізаваныя групы і адзінкавыя турысты. Рэстаўрацыя комплексу працягваецца, у тым ліку за сродкі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Цяпер да ўвагі наведвальнікаў — музей, які складаецца з чатырох экспазіцыйных і выставачных залаў. Працуе сувенірная крама, дзе прадаюцца вырабы майстроў-рамеснікаў. Папулярнасцю карыстаецца рэгістрацыя шлюбу ў непаўторнай гістарычнай атмасферы. У палацы шмат чаго цікавага.

...І ведаеце, пасля пандэміі экскурсанты паехалі настолькі актыўна, што музейныя работнікі не нарадуюцца. Людзі, як выглядае, стаміліся ад розных абмежаванняў, ад уласных страхаў і стараюцца нагнаць упушчанае. Гэта паказаў і фестываль «Ружанская брама», які праходзіў 20 жніўня. На свята сабралася вельмі многа людзей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота БелТА.

# ВАЖНА І ДЛЯ ПРАДАЎЦА, І ДЛЯ ПАКУПНІКА

**НА Гомельшчыне толькі за апошнія два тыдні маніторынгавымі групамі абследаваны 3670 гандлёвых аб'ектаў. Нягледзячы на тое, што за апошні тыдзень на гарачыя лініі па тэме недапушчальнасці росту цэн паступілі толькі два звароты, кіраўніцтвам рэгіёна прынята рашэнне прадоўжыць іх работу ў ранейшым рэжыме.**

Вось ужо больш за месяц суб'екты гандлю ўсіх форм уласнасці працуюць па патрабаваннях Дырэктывы № 10 «Аб недапушчальнасці росту цэн», звярнула ўвагу **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Ірына ДАЎГАЛА:**



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Ірына ДАЎГАЛА і генеральны дырэктар Гомельскага РУП «Фармацыя» Людміла САПЕГА падчас маніторынгу аптэк.**

— Цяпер ужо фактычна ўсе аб'екты гандлю адаптаваліся да новых патрабаванняў па цэнаўтварэнні. Правёўшы за гэты час маніторынг і ў аптэках, і на рынках, і ў сеткавых супермаркетах, і іншых аб'ектах гандлю, можна сказаць, што сітуацыя абсалютна адэкватная і кантраляваная.

Ірына Даўгала днямі правяла маніторынг цэн, наяўнасці і асартыменту тавараў разам з прадстаўнікамі галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Гомельскага аблвыканкама. У цэнтры ўвагі на гэты раз апынуліся аб'екты гандлю, якія рэалізуюць прамысловую прадукцыю.

— Падчас маніторынгу акцэнтавалася ўвага таксама на тым, ці ёсць праблемы з асартыментам тавараў. Дык вось, дэфіцыту тавараў няма. Ёсць перабудова лагістычных ланцужкоў. Нават калі раптам няма тавару, якім прывык карыстацца пакупнік, то яму адразу могуць прапанаваць узамен аналаг і, як правіла, па меншай цане, — патлумачыла Ірына Даўгала.

Парламентарый адзначыла спакойнае ўспрыманне маніторынгу супрацоўнікамі і наведвальнікамі гандлёвых аб'ектаў, што, на яе думку, гаворыць аб упэўненасці ў законнасці і правамернасці цэнаўтварэння.

— Не будзем забываць, што, пераступіўшы парог крамы, усе — і кіраўнікі гандлёвага аб'екта, і прадаўцы — становяцца такімі ж пакупнікамі і спажыўцамі, і таксама жадаюць купіць якасны тавар па прымальным кошце. Цана—якасць — гэта і ёсць асноўны закон эканомікі. І ён павінен працаваць для людзей і на карысць людзей, — перакanana дэпутат.

Падчас апошняга маніторынгу парламентарый таксама наведала аб'ект гандлю, які спецыялізуецца на продажы дываноў айчыннай вытворчасці. Гэта група тавараў таксама знаходзіцца ў вызначаным пераліку з акрэсленай максімальнай гандлёвай надбаўкай.

— Варта адзначыць, што такі тавар пакупнік набывае ў лепшым выпадку раз на некалькі гадоў, а то і больш рэдка. Такім чынам, ёсць шэраг тавараў лінейкі, якая рэдка набываецца, і, зыходзячы з аналізу, магчыма варта перагледзець пералік тавараў, якія падлягаюць лімітаванай надбаўцы. Гэта меркаванне і супрацоўнікаў упраўлення гандлю і паслуг, і суб'ектаў гандлю, — звярнула ўвагу Ірына Даўгала.

Дэпутат падкрэсліла: важна, што практычна ўвесь дэпутацкі корпус уключыўся ў працу па маніторынгу цэн у сваіх рэгіёнах — як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці. Менавіта да дэпутатаў усіх узроўняў грамадзяне ў большай ступені звяртаюцца па тлумачэнні, як працуе заканадаўства ў сферы цэнаўтварэння.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 06.12.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-4101 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 44,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Новогрудский р-н, Любчанский с/с, г. п. Любча, пл. Солобутина, 9а. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424355700001000538, площадью 0,0089 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненская область, Новогрудский р-н, г. п. Любча, пл. Солобутина, 9а |
| **Начальная цена продажи** | 6 028,72 руб. (шесть тысяч двадцать восемь рублей семьдесят две копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 602 руб. (шестьсот два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 02.12.2022 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.04.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

# НАШ ДЗЯДЗЬКА ГЕНА

## Як стараста вёскі робіць малую радзіму прыгажэйшай і больш утульнай

**З Генадзем БЫЦАЕМ я ўпершыню сустрэлася падчас прыёму, які праводзіла дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Людміла Ніжэвіч у Дзешчанскім сельвыканкаме Уздзенскага раёна. Генадзь Іванавіч агучыў актуальныя для аграгарадка Дзешчанка пытанні. Стараста Дзешчанкі — вельмі нераўнадушны чалавек, якому да ўсяго ёсць справа.**



Фота zorkanews.by.

Сярод клопатаў Генадзя Іванавіча — адкрыццё ў Дзешчанцы царкоўнага прыходу.

> «У суткі я сплю вельмі мала. Думаю, як, што зрабіць, каб мае землякі жылі лепш, больш заможна і камфортна. Няма невырашальных праблем. Пры жаданні, настойлівасці можна зрабіць шмат. Галоўнае — не апускаць рукі, і ўсё атрымаецца».

У прыватнасці, Генадзь Быцай распавёў, што на аўтобусным прыпынку, які знаходзіцца на ажыўленай Слуцкай трасе, не гарыць вулічнае асвятленне. Гэта стварае небяспеку для людзей, якія вяртаюцца з работы ў прыцемках вечарам. Цяпер ліхтары на прыпынку гараць.

Акрамя таго, стараста звярнуў увагу на тое, што ў Дзешчанцы выстаўлены на продаж гандлёвы цэнтр, які належыць райспажыўсаюзу. Гандлёвы пункт карыстаецца попытам у пенсіянераў, таму што тут цэны ніжэйшыя, чым



у прыватных крамах, больш шырокі асартымент, а пажылым людзям даюць 10-працэнтную скідку на сацыяльна значныя тавары.

Пасля звароту пытанне вырашылася. Паліцы крамы напоўнілі разнастайнай прадукцыяй. Няма адбою ад пакупнікоў. Вельмі задаволеная і сама прадаўшчыца — выручка ад рэалізацыі тавараў значна вырасла.

— Вось такі нястомны, неўтаймоўны наш Генадзь Іванавіч, — кажа **старшыня Дзешчанскага сельвыканкама Уладзімір БАЛЦЯНКОЎ**. — Я ведаю яго дваццаць гадоў. А працуем у цесным кантакце з ім ужо пяць гадоў, з таго часу як Генадзя Іванавіча выбралі старастам вёскі. У яго вялікі працоўны стаж. Прайшоў шлях ад загадчыка фермы да кіраўніка гаспадаркі. Шмат увагі аддаваў жывёлагадоўлі. На малочнатаварных фермах сельгасарганізацыі, якую ўзначальваў, заўсёды быў узорны парадак. Генадзя Іванавіча кіраўніцтва раёна, вобласці заўсёды ставілі ў прыклад іншым. Ён вельмі неабыякавы да праблем малой радзімы чалавек і абавязковы. Напрыклад, едзе па вёсцы — бачыць непарадак, спыніцца, зробіць заўвагу старасту, а затым вернецца, каб праверыць, ці выправілі недапрацоўкі.

Вось і ў мінулыя выхадныя патэлефанавалі жыхары вёскі Рабінаўка: прапала вада. Уладзімір Балцянкоў звязаўся з Генадзем Быцаем, папрасіў выехаць на месца, разабрацца ў сітуацыі. Аказалася, што жыхары самі спрабавалі адрамантаваць водаправод, але не было неабходных інструментаў. Старшыня сельвыканкама выклікаў спецыялістаў «Водаканала», якія аднавілі падачу вады.

— У мяне ёсць актывісты, якія дапамагаюць вырашаць пытанні жыццядзейнасці жыхароў сельсавета. Але, бадай, галоўны памочнік — Генадзь Іванавіч Быцай, — падкрэслівае Уладзімір Мікалаевіч.

Пры садзейнічанні вясковага старасты ўладкаваны дзіцячы комплекс з сімволікай службы 101 у зоне адпачынку аграгарадка Дзешчанка. Непадалёку размешчаны пост пажарнай службы, таму з тэматыкай вызначыліся хутка.

Вельмі эмацыянальным, радасным, урачыстым стала адкрыццё пляцоўкі. Калі была перарэзаная чырвоная стужка, перад малымі выступіў Генадзь Іванавіч, або, як яго называюць хлопчыкі і дзяўчынкі, дзядзька Гена. Ён нагадаў, што гэтыя атракцыёны трэба берагчы, каб праслужылі як мага больш, паколькі яны — агульны набытак. Акрамя таго, трэба ўсім захоўваць тэхніку бяспекі, а старэйшым дзецям клапаціцца пра самых маленькіх.

Генадзь Быцай ініцыяваў сход прадстаўнікоў грамадскасці і мясцовай улады аб адкрыцці царкоўнага прыходу ў Дзешчанцы. Пакуль абмежаваліся адным пакоем, дзе праходзяць малебны. Кожную нядзелю на богаслужэнне збіраюцца дзясяткі людзей з усяго наваколля.

— Мяркую, вясной пачнём будаўніцтва святыні — спонсараў знайшлі. Гэта будзе вялікі велічны храм, які зможа прыняць шмат вернікаў, — лічыць стараста.

На рахунку Генадзя Быцая многа добрых спраў. Узяць хоць бы добраўпарадкаванне грамадскіх могілак у вёсцы Целякова. Ачысцілі ад хмызняку, спілавалі старыя аварыйныя дрэвы. З тэхнікай дапамаглі кіраўнікі эксперыментальнай базы імя Катоўскага, Целякоўскага лясніцтва, а мясцовыя жыхары вывозілі і палілі адходы. Тэрыторыя могілак пасля агульных намаганняў стала светлай, адкрытай, непазнавальнай.

— Чаму вы, стараста Дзешчанкі, выбралі менавіта Целякова? — пацікавілася ў Генадзя Іванавіча.

— Гэта мая малая радзіма. Тут я нарадзіўся, рос у простай сялянскай сям'і, маці ўсё жыццё працавала даяркай, цяпер ёй 93 гады. Мае бацькі выхоўвалі шасцёра дзяцей, на жаль, брат і сястра ўжо пайшлі з жыцця. Родны сэрцу куток мы павінны праслаўляць добрымі справамі, — прагучала ў адказ.

Генадзь Іванавіч напрыканцы прызнаўся, што за ўсё жыццё ні разу не быў за мяжой, у адпачынку, толькі адзін раз наведалі з жонкай, сваёй вернай сяброўкай, Алушту. Ніколі сужэнцаў не цягнула на заморскія курорты, мілейшага і прыгажэйшага за родны куток, дзе нарадзіўся, жаніўся, вырасціў дзяцей, нічога ў свеце няма.

У суткі я сплю вельмі мала, — кажа мой суразмоўнік. — Думаю, як, што зрабіць, каб мае землякі жылі лепш, больш заможна і камфортна. Няма невырашальных праблем. Пры жаданні, настойлівасці можна зрабіць шмат. Галоўнае — не апускаць рукі, і ўсё атрымаецца.

Планаў у Генадзя Іванавіча шмат. І хочацца пажадаць яму ўдачы ў ажыццяўленні задум. Мяркую, разам з мясцовымі ўладамі, жыхарамі ўсё ў яго атрымаецца. Галоўнае, што тут працуюць разам, талакой.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)* по поручению открытого акционерного общества «Сковшин» *(Продавец)* проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА ДЛЯ МАТЕРИАЛЬНЫХ ЦЕННОСТЕЙ,**

**инв. № 644/С-60663, общей площадью 567,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625081306101000342** *(право аренды по 08.02.2120)* **площадью 0,4409 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Домановичский с/с, аг. Сковшин, ул. Краснознаменная, 39.**

*Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,2518 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **40 479,20** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 20 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **4 047,00** бел. руб.

